ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 7 (4255)
Субота, 9 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

## Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Пашырэньне японскай інтэрвэнцыі ў Манчжурыі. Бугроў—Паказальнікі нашых перамог (2 стар.).

А. САКАЛЕНКА—Мэталяпрамысловасьць БССР да XIV зьезду КП(б)Б (3 стар.). Каршакевіч—Год работы машынатрактарных станцый у БССР (3 стар.).

XIV партзьезду рапартаваць выкананьнем сустрэчных плянаў збожжазагатовак (1 стар.).

Узьняцьце ўнутрыпрамысловых накапленьняў—важнейшы вагар рацьбы за прамфінплян (1 стар.).

У абставінах жорсткай клясавай барацьбы, у змаганьні за генеральную лінію партыі Слуцкая партарганізацыя да сваёй 8-ай канфэрэнцыі дабілася вялікіх посьпехаў у разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі (2 стар.).

Пакласьці канец недаацэнцы важнейшай кампаніі (3 стар.).

Ільназагатоўкі—На 6 студзеня—толькі 46,2 проц. пляну (4 стар.).

МАНЧЖУРЫЯ—Акупацыя Шанхай-гуаня японцамі.

# Пашырэньне японскай інтэрвэнцыі ў Манчжурыі

Японія паведамленьні з Манчжурыі сьведчаць аб новым вельмі значным узмацненьні актыўнасьці японскіх інтэрвэнтаў. Выкарыстоўваючы поўную пасыўнасьць гаміндановскага ўраду, пры патуранні і больш-менш замаскаваным або нават адкрытым падтрыманьні з боку Лігі нацый і паасобных імпэрыялістычных дзяржаў, японская ваенщчына сьпяшаецца пашырыць сфэру акупацыі. 2 студзеня японскімі войскамі занята вузлавая чыгуначная станцыя Цзіньчжоу на Мукдэнскай чыгунцы. З заняцьцем Цзіньчжоу японская армія аўладала важным стратэгічным пунктам, **панаваньне над якім ня толькі азначае ўзмацненьне японскай акупацыі ўсёй паўднёвай Манчжурыі, але і забясьпечвае далейшае наступленьне ў межы ўласнага Кітаю, за так званую вялікую Кітайскую сьцяну.**

Што намеры японскай ваенщчыны ідуць у гэтым кірунку, відаць з таго, што сьледам за заняцьцем Цзіньчжоу японскія войскі пачынаюць прасоўвацца на поўдзень. Японскае тэлеграфнае агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе, што **некалькі брыгад з дывізіі Мурю**, прызначанай для «аховы» Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі, **адпраўлены з Цзіньчжоу на Шанхай-Гуан**, які прадстаўляе «браму» ва ўласны Кітай. Адначасова японская ваенщчына накіроўвае часьці для заняцьця Цзянь-сіню і порту Таку, японскія ваенныя сілы займаюць кітайскія парты Цзіньвандао і Хулудао. Апошні порт прадстаўляе асаблівую важнасьць для японскага імпэрыялізму, паколькі ў праектах кітайскага чыгуначнага будаўніцтва гэты порт (да абсталяваньня якога прыступілі толькі пару год назад) адыгрываў выключна вялікую ролю, як выхад для таварных патокаў, якія павінны накіроўвацца па кітайскіх чыгунках. Порт Хулудао меў прызначэньнем адцягнуць таварныя грузы, што сьледуюць з Манчжурыі, ад Паўднёва-Манчжурскай чыгуны, якая знаходзіцца ў руках японцаў, і японскага порту Дайрэна і накіраваць іх па Кітайскай чыгуначнай сыстэме. Сёньняшні тэлеграф прынёс весткі аб захваце Шанхайгуаня і далейшым прасоўваньні японскіх войск на поўдзень для акупацыі унутраной Манголіі.

Адначасова з пашырэньнем японскай акупацыі на поўдні Манчжурыі, японскі імпэрыялізм разгортвае актыўную «работу» і ў паўночнай Манчжурыі. Для нас даўно ўжо ня было тайнай, што існуе вельмі «інтымная» і цесная сувязь паміж японскай ваенщчынай і рускімі белагвардзейцамі ў паўночнай Манчжурыі. З першых-жа дзён японскай авантуры ў Манчжурыі можна было назіраць значнае зжыўленьне сярод белагвардзейскай эміграцыі. Белагвардзейскія эмігранты зараз адкрыта выступаюць у якасьці актыўных агентаў японскага імпэрыялізму. У той самы час, як на поўдні японскія войскі займалі Цзіньчжоу, белагвардзейская эміграцыя ў Харбіне паладзіла ўзброеную дэманстрацыю супроць тэй часткі кітайскай адміністрацыі, якая лічыцца на баку Чжан Сюэ-ляна, супроць якое японцы вядуць барацьбу. Адначасова белагвардзейцы дэманстравалі свае вернападданніцкія пачуцьці да Японіі. Сваёй дэманстрацыяй белагвардзейскія бандыты даюць зразумець японскай ваенщчыне, што яна можа разьлічваць у любы момант на паслугі белых эмігрантаў.

Гаміндановскі ўрад, які на працягу году сыстэматычна прадае імпэрыялістам інтарэсы пматмільённых мас Кітаю перад постацыю ўсё больш і больш наглеючай японскай ваенщчыны, застаецца верным сваёй звычайнай тактыцы. Кітайскі міністар замежных спраў у прамове, прысьвечанай манчжурскаму пытаньню, 4 студзеня заявіў, што **«сьцярпімасьць манчжурскага пытаньня трэба дабівацца дыплёматычным шляхам»**. Ясна, што здрадніцкага цынізму значна больш чым глупства ў гэтым сказе гаміндановскага міністра. Ён гаворыць гэта пасьля таго, як вопыт амаль чатырох месяцаў японскай акупацыі, крывадушных словаспрэчак у Лізе нацый і папяровых пратэстаў з боку гаміндановскага ўраду паказаў, як мала лічыцца японская ваенщчына са спробамі зрабіць на яе націск «дыплёматычным шляхам». Вярней за ўсё, аднак, што фраза Яўгена Чэна (міністра замежных спраў Кітаю) азначае **падрыхтоўку спробы змовы паміж Гаміндановам і японскімі захватчыкамі, змовы за кошт інтарэсаў працоўных мас Кітаю і супроць СССР.** І сапраўды, тэлеграмы з Шанхаю паведамляюць аб тым, што ў хуткім часе адбудуцца перагаворы паміж Яўгенам Чэнам і японскім пасланьнікам у Кітаі Сігемітцу, прычым японцы надаюць гэтым перагаворам вялікае значэньне.

Французкі імпэрыялізм усё яшчэ захоўвае пазыцыю безагаворачнага падтрыманьня японскіх захватчыкаў. Французкі буржуазны друк ухваляе «энэргічныя дзеяньні» японскіх генэралаў і цынічна здзекуецца над Лігай нацый, якая як вядома, вылучыла спэцыяльную міжнародную «камісію для вывучэньня» становішча ў Манчжурыі. Гэта камісія дасюль яшчэ не магла прыступіць да сваёй «дасьледчай» работы з тэй простай прычыны, што камісія... усё яшчэ «не скансструявалася».

Імпэрыялістычная і інтэрвэнцыяністская сутнасьць Лігі нацый з такой надзвычайнай яркасьцю выкрыта ў сьвятле манчжурскіх падзей, што нават буржуазны друк больш ня здолее ўтаіць гэтага факту. Орган нямецкай цяжкай індустрыі «Лёкаль Анцэйгер» адкрыта заяўляе, што **«Японія дасягнула сваёй мэты не наперакор Лізе нацый, а дзякуючы Лізе нацый»**. Буржуазна-лібэральная «Фосішэ Цэйтунг» прызнае, што «аўтарытэт Лігі нацый панёс страту, якую наўрад ці можна чым-небудзь кампэнсаваць».

«Посьпехі» японскай ваенщчыны, якія ствараюць простую пагрозу японскага ўрыву ва ўласны Кітай, у якім непасрэдна зацікаўлен амэрыканскі капітал, пасуміненна будуць мець сваім вынікам абвастрэньне супярэчнасьцяй паміж Японіяй і ПАЗШ. Да гэтага часу амэрыканскі імпэрыялізм спакойна сачыў за японскай акупацыяй Манчжурыі, разьлічваючы на тое, што ўдасца спрэкакаваць СССР і ўцягнуць нас у вайну з Японіяй, якая была-бы пачаткам шырокай узброенай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. У Амэрыцы разьлічвалі на тое, што японскі імпэрыялізм задаволіцца Манчжурыяй і ня будзе пашыраць свае апэтыты на ўласны Кітай. Нэрвознасьць, з якою ў Амэрыцы сачылі за японскімі падрыхтаваньнямі да захвату Цзіньчжоу і Шанхайгуану, прымушае чакаць, што зараз, калі гэта заняцьце стала фактам, адносіны паміж ПАЗШ і Японіяй увойдуць у фазу абвастрэньня.

Такому абвастрэньню будуць спрыяць і інцыдэнты з афіцыяльнымі амэрыканскімі дыплёматычнымі і консульскімі прадстаўнікамі, якія разгараліся ў апошнія дні ў Манчжурыі. Арышт японцамі памочніка амэрыканскага ваеннага аташэ ў Гоўбанцзы і зарыпт і збойства японскімі салдатамі амэрыканскага віцэ-консула ў Мукдэне, толькі што атрымаўшага назначэньне на пост генэральнага консула ПАЗШ у Харбіне, цікавы тым, што, з аднаго боку, гэта — відавочная аплявуха амэрыканскаму «прэстыжу» на Далёкім Усходзе, а, з другога боку, падобныя інцыдэнты яўна сьведчаць аб тым, што калі дыплёматычныя адносіны паміж Вашынгтонам і Токіё ўсё яшчэ захоўваюць звонку «ветлівы» характар, дык у самой Манчжурыі, дзе непасрэдна сутыкаюцца інтарэсы японскага імпэрыялізму і імпэрыялізму ПАЗШ, адносіны паміж амэрыканцамі і японцамі набываюць надзвычай напружаны і абвостраны характар. У гэтай сувязі цікава паномніць, што з першых-жа дзён канфлікту амэрыканскія газэты, якія выходзяць у Кітаі, запялі ў адносінах да Японіі рэзкі і адкрыта варожы характар, які радыкальна адрозьніваецца ад стрыманага тону, у якім выказваўся друк ПАЗШ.

Працоўныя масы Кітаю выносяць на сабе ўвесь цяжар японскай інтэрвэнцыі і драпежніцкай эксплёатацыі з боку замежных імпэрыялістаў. Падзеі ў Манчжурыі яшчэ раз з вычарпальнай пераканальнасьцю выкрываюць перад працоўнымі Кітаю здрадніцкую ролю Гаміндану, які выдае кітайскіх рабочых і сялян на разграбленьне замежным імпэрыялістам. Урокі японскай інтэрвэнцыі будуць спрыяць пашырэньню і ўзмацненьню ўплыву кітайскай кампартыі на пматмільённыя працоўныя масы Кітаю, якія з кожным днём пераконваюцца, **што толькі рэвалюцыйнае паўстаньне працоўных, пад кіраўніцтвам кампартыі, здольна вызваліць Кітай ад ярма замежных імпэрыялістаў і кітайскай буржуазіі і фэадалаў.** Апошнія паведамленьні сьведчаць аб значных посьпехах кітайскай Чырвонай арміі, уплыў якое пашыраецца на пункты, якія нават прымыкаюць да Ханькоу. Урадавыя войскі, навіраваныя супроць чырвоных часьцей, падымаюць сьцяг паўстаньня і далучаюцца да чырвоных.

Дзеяньні імпэрыялістычных разбойнікаў у Манчжурыі з кожным днём спрыяюць узьняцьцю клясавай самасьвядомасьці пматмільённых працоўных мас Кітаю. **Вузел, завязаны інтэрвэнцыяй японскага імпэрыялізму ў Кітаі, будзе расьсечан пераможнай кітайскай рэвалюцыяй.**

# XIV ПАРТЫІНАМУ ЗЬЕЗДУ РАПАРТАВАЦЬ ВЫКАНАНЬНЕМ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

## Да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў

Калгасьнікі, аднаасобнікі — беднякі і сераднякі **ЎВАРАВІЦКАГА** раёну пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі заваявалі перамогу ў выкананьні адной з баявых палітычна - гаспадарчых кампаній.

**XIV зьезду КП(б)Б мы рапартуем:**

План збожжазагатовак у колькасьці 1.200 тон намі ня толькі выкананы, але і **перавыкананы**. На сёньняшні дзень загатоўлена 1.239 тон, або 103 проц. заданьня. Прычым калгасамі здана (прадана) 103,3 проц., аднаасобнікамі —101,4 проц.; па памольным зборы—70 проц.

Выканан і перавыкананы таксама плян загатовак сена. З кожным днём **нарастаюць тэмпы** загатоўкі тэхнічных культур, якія дасягнулі па ільнавалакне і трасьце 85 проц. заданьня, па пяньцы — каля 100 проц., што перавышае сярэдні рэспубліканскі процант.

**Нашы перамогі ёсьць рэзультат сапраўды штурмавой работы.**

Зразумеўшы ўказаньне правадыра нашай партыі т. Сталіна, аб тым, што для пасьпяховага выкананьня збожжазагатовак **«патрэбна перш за ўсё ліквідаваць псыхалёгію самацёку, як шкодную і небясьпечную рэч, патрэбна арганізаваць загатоўні»**,—раённы камітэт партыі разгарнуў масава-палітычную работу сярод аднаасобнікаў і калгасьнікаў, барацьбу з кулацка - рвацкімі тэндэнцыямі адсталых груп калгасьнікаў, з праваапартуністычнімі і «лявацкімі» скажэньнямі лініі партыі.

Каляндар штурмавых дзён на збожжазагатоўчым фронце расказвае аб тых формах і мэтадах кіраўніцтва і работы, якія забясьпечылі перамогу.

У чым іх «сакрэт»?

**Па-першае**, у строгім уліку і штодзенным кантролі.

**Па-другое**, у апэрацыйнасьці кіраўніцтва і маноўраздольнасьці. Апошняе заключаецца ва ўменьні хутка вылавіць, дзе слабыя вучасткі (сельсаветы, калгасы), і забясьпечыць іх сіламі.

**Па-трэцяе**, у мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў, укараненьні ў сьвядомасьць кожнага камуніста, кожнага калгасьніка, што справа загатовак — баявая палітычная справа.

**І чацьвертае**, самае галоўнае — у масавасьці работы, цэпрымірымасьці да ўсіх і ўсялякіх скажэньняў лініі партыі і рашучай барацьбе з кулаком.

**Як мы рэалізавалі гэтыя задачы?**

Зводка за першую пяцідзеўку кастрычніка паказвала 37,5 проц. Тэмпы нарастаньня былі настолькі нізкія, што не забясьпечылі выкананьня пляну ў тэрмін. Навісла трывога. Райком КП(б)Б абвяшчае дэкаднік штурму. У сельсаветы накіроўваюцца дзесяткі брыгад. Мабілізован увесь партыйны, прафсаюзны, камсамольскі актыў, работнікі апарату райкалгасаюзу, каапсаюзу і г. д.

Усё гэта адгукнулася **штурмавой упартай работай у сельсаветах і калгасах.**

Пленумы сельскіх саветаў, дзесяткі сходаў актыву, агульныя сходы беднякоў і сераднякоў паселішч, пматлікія сходы калгасьнікаў, гутаркі групавыя і індывідуальныя, лёзунгі, плякаты у хатах - чытальнях, клюбах і школах, чорныя і чырвоныя дошкі ў РВК, райсаюзе, у кожным сельсавеце і калгасе і інш.—усе гэтыя формы і мэтады масава-агітацыйнай работы **былі пастаўлены на службу збожжазагатоўчай кампаніі.**

Гаварылі, галасавалі за збожжазагатоўчы плян, выказвалі гатоўнасьць у тэрмін выканаць свае абавязкі перад дзяржавай ня толькі людзі — калгасьнікі і аднаасобнікі — беднякі і сераднякі. Поўным голасам таксама загаварылі — зараўлі малатарні. **Патокам пайшлі чырвоныя абозы.**

**За адзін дзень першай дэкады кастрычніка чырвонымі абозамі раёну здана 20 проц. пляну.**

Гэта работа не абмежавана толькі дэкаднікам. **Штурм абвешчан да канца збожжазагатоўчай кампаніі.**

Такім чынам, ад 37,5 проц. на 5 кастрычніка крывая загатовак узьнялася да 59,8 проц. на 15 кастрычніка, 71,7 проц.—па 25-га, 82,6% —на 10 лістапада, 90,9 проц.—па 20-га, 97,2 проц.—на 10 сьнежня і 100,3 проц.—на 20 сьнежня 1931 году.

Адна з важнейшых умоў нашых перамог закладзена ў строгім уліку, штодзенным кантролі і ліквідацыі ва ўсіх зьвеньнях загатоўчай работы абвільготы. Гэта дасягнута шляхам устанаўленьня цьвёрдых і непарушных тэрмінаў ня толькі для сельсаветаў, але для кожнага калгасу і паселішча, для кожнага кулацка-заможнага двара. Кожны дзень кантраляваўся заданьне па ўсёй лініі—у раённым разрэзе, сельсавеце, калгасе, паселішчы, вучастку.

Пяцідзённая зводка—пульс кампаніі—строгімі лічбамі паказвала ўдарнікаў загатоўчага фронту і сьцьвілізавала аб прарывах на паасобных вучастках. Апэрацыйнасьць кіраваць заключалася і ў тым, што слабыя адстаючыя вучасткі на першых-жа кроках зьніжэньня тэмпаў адтрымлівалі падмогу, забясьпечваліся новымі сіламі.

Так было з **Азьдзеленскім** сельсаветам, які пры дапамозе раённай брыгады і брыгады калгасьнікаў у ліку 15 чалавек за месяц навысіў процант выкананьня пляну з 45 да 88,7 проц. Так было з Крыўскім сельсаветам, які ад дзесятка процантаў за паўтара месяца выйшаў у перадавыя рады, дасягнуўшы 100 проц. выкананьня пляну. Так было па радзе астатніх калгасаў.

Было-б бязьмежным глупствам думаць, што выкананьня пляну збожжазагатовак можна дасягнуць ціха, без баёў з клясавым ворагам—кулаком.

Лёзунг ЦК УсеКП(б): **«Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку»** зразумелі мы ня толькі, як задачу барацьбы з прыватным скупшчыкам, спэкулянтам, але,як задачу барацьбы з кулаком, які сабатуе заданьне дзяржавы, з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі ў калгасах, што ідуць у тым-жа напрамку, з правымі апартуністамі—гэтай агентурай кулака.

Правыя апартуністы і «левакі», да памагаючы кулаку ў яго імкненьнях сарваць збожжазагатоўчы плян, прабавалі на паасобных вучастках (некаторых сельсаветах і калгасах) прабіць шчыліну ў гэтым важнейшым мерапрыемстве.

«Левакі» з **Бацунскага** сельсавету, ідучы падкрэсьліваючы сваю кулацкую прыроду, ідэалёгічнае раўство з правымі, з аднаго боку, даводзілі цьвёрдыя заданьні да серадняка, а з другога—не націскалі на кулака, аб'ектыўна дапамагаючы яму гнаіць збожжа ў ямах. «Левакі» са **Стара-Беліцкага** сельсавету, у асобе старшыні **Лапцева**, дагналі цьвёрдыя заданьні да 40 проц. агульнага пляну.

Правыя апартуністы з **Блюдніцкага** сельсавету ў асобе **Смалякова і Цілічэнкі**, патураючы кулаку, зьменшылі агульны плян і не далі зусім цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам.

У выніку наяўнасьці праваапартуністычных скажэньняў у рабоце паасобных сельсаветаў, цьвёрдыя заданьні па раёне спагнаны ўсяго на 86 проц.

**Важнейшай умовай выкананьня пляну зьяўляліся імкненьні рашучы націск на кулака і бязьлітасная барацьба з яго праваапартуністычнай і «лявацкай» агентурай.**

Выпраўляючы «левыя» загібы, ламаючы апартуністычнае супраціўленьне кулацкай агентуры, партыйныя ячэйкі дабіліся, што адсталыя ў мінулым Бацунскі і Стара-Беліцкі сельсаветы ўжо выканалі **СУСТРЭЧНЫЯ** пляны: першы—на 73 проц. і другі—на 80 проц.

Перамогі нашага раёну—**гэта яшчэ адзін яркі доказ** рэальнасьці нашых плянаў, поўнай магчымасьці іх выкананьня і перавыкананьня.

Рапартуючы партыйнаму зьезду аб нашых посьпехах, якія дасягнуты пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, **мы высоўваем СУСТРЭЧНЫ** плян у колькасьці 250 тон збожжа, з якіх 100 тон абавязаліся выканаць калгасы і 150 тон—аднаасобнікі.

Мы абавязваемся **поўнасьцю рэалізаваць сустрэчны плян**, а таксама спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак у адрэзак часу да XIV зьезду КП(б)Б.

Мы абавязваемся таксама да партыйнага зьезду **заняпільць ільназагатоўкі** і ліквідаваць той прарыў, які стварыўся ў нашым раёне па мабілізацыі сродкаў.

З гэтай мэтай у раёне разгортваецца масава-палітычная работа, праводзіцца цэлы рад мерапрыемстваў. У кожны сельсавет пасланы брыгады партыйнага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву.

Нарада сакратароў партыйных ячэек, нарада старшынь і сакратароў сельсаветаў, нарада старшынь калгасаў, зварачаючыся з гэтым лістом да калгасьнікаў і аднаасобнікаў, **абязсьцілі слабе мабілізаваньні** на выкананьне пляну ільназагатовак, мабілізацыі сродкаў і **СУСТРЭЧНАГА** пляну па збожжы.

Раённая газэта «Калектывіст», у мэтах мабілізацыі рабселькораў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў па рэалізацыю сустрэчнага пляну па збожжы, склала 5 ударных брыгад друку для выпуску штодзённак у сельсаветах, калгасах, для правядзеньня цэлага раду арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў і асьвятленьня ходу работы ў «Калектывісьце».

Расказваючы ў гэтым лісьце аб нашых перамогах, аб формах і мэтадах работы, **мы зварачаемся да ўсіх раёнаў, якія адстаюць, да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў з заклікам вывучыць вопыт нашай работы і да XIV зьезду КП(б)Б закончыць збожжазагатоўкі і загатоўкі ільнавалакна**, яшчэ больш увагі і сіл на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на падрых тоўку да веснавой сяўбы.

Наш лёзунг—**НІ АДНАГО СЕЛЬСАВЕТУ І КАЛГАСУ, НІ АДНАГО ПАСЕЛІШЧА БЯЗ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ.**

Права рапартаваць партыйнаму зьезду мае толькі той раён, той сельсавет і калгас, які ня толькі поўнасьцю рэалізаваў заданьне, але **выканаў і перавыканаў сустрэчны плян.**

**ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА РАПАРТАВАЦЬ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б**, які зьбіраецца напярэдадні XVII ленінскай усесаюзнай партканферэнцыі — справа гонару, славы і гэройства кожнай раённай арганізацыі, кожнага сельсавету і калгасу, кожнага камуніста і камсамольца, кожнага калгасьніка!

Сакратар РК КП(б)Б ВАСІЛЬЕВА.
Старшыня РВК КАРАЛЕНКА.
Старшыня райкалгасаюзу ІСАТЧАНКА.

Старшыні сельсаветаў: ЦІМАХОВІЧ, СЕМЕНЯКІН, МАКСІМЕНКА, ПАДОЛЬСКІ, КАБЯЛКА, КРАЎЧАНКА, ВАСІЛЬЦОЎ, КАВАЛЕНКА, РУБАНАЎ.

Старшыні калгасаў: ГАРАЕЎ, ВІШНЯКОЎ, УСЕВІЧ, КАВУНОЎ, ПРАХАРЭНКА, ЗЬБЛЕЎ, ГАЛЕНДА, ХЛЕБАЖАЗАЎ, УСЕВІЧ, ШВАДРОНАЎ, КАРПЕНКА, СРОЛІКАЎ, РУБАНАЎ, МІРОНЕНКА, КРАЎЦОЎ, ДЗЕГЦЯРОЎ, ВОЙТАЎ, УСЬЦІНОВІЧ, ЗАХАРЧАНКА, НОВІКАЎ, ЧЫСТОЎ.

*Усебеларускі рэйд па праверцы рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна*

# *Узьняцьце ўнутрыпрамысловых накапленьняў*

## важнейшы вагар барацьбы за прамфінплян

### Сацыялістычную рацыяналізацыю—у парадак дня!

Яшчэ ў пачатку ліпеня цэхі МАШЫНА-БУДАЎНІЧАГА ЗАВОДУ «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» (Віцебск) былі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Але да 1 кастрычніка ўся гэта работа насіла чыста фармальны характар, бо не ажыцьцяўлялася яе абавязковая ўмова—кантроль рублём. Толькі калі былі заключаны дагавары паміж цэхамі, на аснове забясьпячэньня камплектнага выпуску дэталяй згодна праграмы і жорсткага кантролю за выдаткаваньнем вызначаных фондаў, выходзячы з фактычнага выкананьня пляну таго ці іншага цэху, новая сыстэма работы ўвайшла ў свае правы.

Але і зараз гаспадарчы разрахунак на заводзе патрабуе далейшага пагыбленьня. На заводзе працуе 21 гаспарадча-разрахунковая брыгада з ахопам 270 чалавек. Кіраўніцтва гэтымі брыгадамі не наладжана. Да апошняга часу ня вёўся ўлік эфэктыўнасьці работы брыгад. Праверка такарнага цэху паказала, што прамфінплян ня выконваецца з-за дрэннай падачы неабходных фабрыкатаў. Брыгады зусім не вядуць уліку па формах, выпрацаваных бюро рацыяналізацыі. Не наладжан кантроль з боку майстроў цэху за выкананьнем заключаных брыгадамі дагавораў.

Цэхавыя парт'ячэйкі яшчэ ня сталі на чале барацьбы за правядзеньне сапраўднага гаспадарчага разрахунку на заводзе.

Да гэтага трэба дадаць наяўнасьць вялікага процанту браку на асобных дэталях, што пры адсутнасьці запасу адлітых дэталяй значна адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

Калі мы возьмем, напрыклад, ліцейны цэх, дык тут за час з 11 па 20 сьнежня брак ліцьця на жмыхадрабілках складае 11 проц., на корнярэзках — 13,4 проц., па бульбакапалках — 18,8 проц., па лябёдках—20,6 проц.; агульны процант браку на фармоўцы перавышае 10 проц. Гэта тлумачыцца наборам пекваліфікаваных рабочых і адсутнасьцю належнага тэхнічнага кіраўніцтва і кантролю.

Нельга лічыць здавальняючым ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў на заводзе. У 3-м квартале трэба было праверыць 62 прапановы, якія павінны былі даць эканоміі 274 тыс. у год; плян выкананы сумарна на 8 проц. Ня выкананы таксама плян 4 кварталу; ён часткова перанесен на 1 квартал 1932 году. Прычыны—бюракратычныя адносіны да рацыяналізацыі з боку аддзелаў заводакіраўніцтва, невыстарчальны націск аддзелу рацыяналізацыі на адміністрацыю цэхаў і слабая ўвага гэтаму пытаньню з боку цэхавых ячэек.

З-за нядбайнасьці тэхнічнага аддзелу не рэалізавана каштоўнейшая прапанова — пераканструяваць жмыхадрабілку шляхам замены жалеза чыгуном; гэта выпаходка пасылалася на экспэртызу ў адпаведны навукова-дасьледчы інстытут, які даў вельмі добрыя водзывы. Рэалізацыя гэтай прапановы павінна была даць эканоміі 95 тыс. руб. у год.

Агульны вывад — гаспадарчы разрахунак, сапраўдны кантроль рублём, барацьба за эканомію не знайшлі яшчэ належнага праламленьня ў рабоце заводу «Чырвоны мэталіст».

Брыгада: **Сьцефановіч** і **Яечка**.

### Забясьпечыць дзейнасьць заключаных дагавароў

Гаспадарчы разрахунак на машынабудаўнічым заводзе «Пралетары» (Гомель) уведзен яшчэ 1 ліпеня 1931 году. Дзесяць цэхаў заводу пераведзены на новую сыстэму работы. З 40 вытворчых брыгад перайшлі на гаспадарчы разрахунак 16 брыгад і 20 варштатаў. Ахоплены гаспадарчым разрахункам 254 рабочыя—24 проц. усяго складу.

Заводакіраўніцтва вылучыла цэхам ліміты, у межах якіх яны маюць права весьці свае звароты. Сырэц і матар'ялы адпускаюцца па плянавым сабекошце. Паміж цэхамі заключаны дагаворы, якія прадугледжваюць матар'яльную адказнасьць за невыкананьне абавязкаў. Аднак, гэтыя дагаворы рэалізуюцца нездавальняюча і не ажыцьцёўлена сапраўдная адказнасьць за іх парушэньне.

Напрыклад, аддзел мэханікі заключыў дагаворы з усімі цэхамі на рамонт абсталяваньня, але іх ня выконвае. Зроблены рамонт нядобранасны. Былі выпадкі, калі на зборку выштатаў пасылаліся не кваліфікаваныя рабочыя, якія, разабраўшы машыны, не маглі іх сабраць, кідалі работу, што затрымлівала рамонт. Чыгуналіцейны цэх, замест прадугледжанага дагаворам штодзённага вырабу для арматурнага цэху 35 кандэнсацыйных гаршкоў, з 1 па 17 сьнежня ня даў ні аднаго.

З-за дрэннай арганізацыі працы ня зьнты прастоі і звышнармовыя работа. У кастрычніку была 701 гадзіна прастоў, а ў лістападзе—некалькі тысяч. Адна з прычын—недахват рабочай сілы, асабліва па трэцяй зьмене. Гэта гаворыць аб няправільнай расстаноўцы наяўнага ліку рабочых. Не ліквідавана канчаткова абязьлічка ў карыстаньні інструментамі. У чыгуналіцейным цэху пасьля сканчэньня работы інструмант увесь кідаецца на зямлю, майстру прыходзіцца зьбіраць яго. Не ўстаноўлена адказнасьць за захаваньне інструмантаў. Няма таксама адказнасьці за пасаваньне тых ці іншых прылад. У кавальскім цэху было некалькі выпадкаў паломкі інвэнтару, але ніхто не панёс пакараньня.

Заводскім арганізацыям трэба яшчэ многае зрабіць, каб ліквідаваць абязьлічку, замацаваць варштаты і інструманты за рабочымі, устанавіць суровую адказнасьць за прылад.

Асноўная задача заводскай грамадзкасьці—правесьці ў жыцьцё сапраўдны гаспадарчы разрахунак, поўнае выкананьне заключаных дагавароў.

**Брыгада: Лебедзеў, Тульман**

### Унутрызаводзкія накапленьні—заняць баны вучастак

Былыя апартуністычныя кіраўнікі добрускай фабрыкі «Герой працы», калі ім паказвалі на нездавальняючае фінансавае становішча фабрыкі, заўсёды ківалі ў бок торфазаводу—быццам толькі перабоі ў забясьпячэньні фабрыкі апалам зьяўляюцца прычынамі ганебнага адставаньня фабрыкі. Але што зрабіла фабрычнае кіраўніцтва, каб палепшыць фінансавую гаспадарку прадпрыемства за кошт рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, каб узмацніць унутрызаводзкія накапленьні, каб дабіцца эканоміі грошай за кошт скарыстаньня адкідаў і інш. На гэта пытаньне даюць адказ факты.

Адкіды аддзелу рэгенэрацыі—так зв. чорны содавы шлях—зьяўляюцца вельмі каштоўным відам апалу, цёпла творнасьцю ў 4 тыс. калёрый. 760 тон гэтых адкідаў у год выкідваюцца ў рэчку.

Адыходы лесазаводу (апілкі, трэскі) таксама не скарыстоўваюцца і здаюцца наўкольнаму насельніцтву.

Адыходы саломаварачнага аддзелу ў колькасьці 650 тон у год выкідваюцца без усякай карысьці для прадпрыемства.

Каля фабрыкі вырасла высокая крэйдавая гара, якая складаецца з адкідаў вапны.

Гэтыя адкіды зьяўляюцца вельмі каштоўным матар'ялам, з якога пры паўторным апальваньні ў гофманскіх печах можна атрымаць вапну. Фабрыка можа з'эканоміць 4.000 тон вапны на суму 80.000 руб. Апраза гэтага адкіды крэйдавай гары можна скарыстаць у якасьці матар'ялу для папаўніцеля паперы і з'эканоміць такім чынам 180.000 руб. у год.

Гэтага ня робіцца. Аб гэтым кіраўніцтва фабрыкі менш за ўсё думала. Можна прывесьці яшчэ шмат рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, выкананьне якіх магло-б забясьпечыць палепшэньне становішча фабрыкі. Аднак, і гэтых досыць, каб прыйсьці да вываду, што за шырмай «аб'ктыўных прычын» хавалася няўменьне і нежаданьне перабудаваць вытворчую работу на аснове самай шырокай сацыялістычнай рацыяналізацыі і скарыстаньня захаваных рэсурсаў.

А.

### Гаспадарчы разрахунак праведзен фармальна

**Ільнапрадзільная фабрыка «Дзьвіна»** праграмы 1931 году поўнасьцю ня выканала. Адной з прычын нездавальняючага ажыцьцяўленьня вытворчых заданьняў зьяўляецца **слабое ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў цэхах фабрыкі.** «Дзьвіна» толькі фармальна перайшла на гаспадарчы разрахунак. Фабрычныя арганізацыі абмежаваліся заключэньнем дагавароў. Цэхавыя балянсы і калькуляцыі ня складзены. Не наладжаны разрахункі паміж цэхамі. Не ўстаноўлен кантроль за выкананьнем дагавароў.

Зусім мала ўвагі аддаецца **ўнутрыфабрычным накапленьням.** У 1 і 2 квартале ільнан рацыяналізацыі адсутнічаў, у 3-м квартале з-за недавыкананьня рацыяналізатарскага пляну фабрыка мела страт больш чым на 47 тыс. руб. У 4-м квартале з 17 рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў праведзены толькі 9. 112 рабочых прапаноў вытворчага характару па пытаньні аб барацьбе са стратамі згублены.

На фабрычным дварэ валяцца розны лом — шасьцярні, шківы, лябёдкі, — які можна скарыстаць. Вугаль і торф ляжаць пад сьнегам, і ніхто не зварачае ўвагі на злачынае разбазарваньне каштоўнага апалу. У ватэрным цэху стаяць без руху 11 ватэраў і 2 банкаброшы. З Вязьнікаў прывезьлі шліфтавальную машыну для ткацкага цэху. У часе ўстаноўкі машыны выявіўся недахват раду часьцей. Калі аб гэтым было паведамлена тэхнарыку Балабуху, апошні спакойна адказаў: «Што-ж, прыдзецца ку ніць другую шліфтавалку».

Гэтыя факты гаворыць аб адсутнасьці сапраўднага гаспадарчага разрахунку на фабрыцы «Дзьвіна». Калі дадаць да гэтага адсутнасьць работы па мэханізацыі і мемэнты абязьлічкі — перакідкі людзей з машыны на машыну, дык стане зразумелым, чаму фабрыка «Дзьвіна» прышла да 1932 году з нездавальняючымі колькаснымі і якаснымі паказальнікамі выкананьня прамфінпляну.

Задача выкананьня вытворчых заданьняў патрабуе самай рашучай барацьбы за рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна, за ўзмацненьне ўсіх крыніц накапленьняў, правільнага вядзеньня гаспадаркі і эканоміі кожнай савецкай капейкі. Аб гэтым павінны цьвёрда запамятаць партыйныя, прафэсіянальныя і гаспадарчыя арганізацыі фабрыкі.

Брыгада «Зьвязды»: **Кроль, Генрых, Зарубежны.**

## УСІМ РАЙКОМАМ КП(б)Б

**Весткі, якія ёсьць у распараджэньні ЦК КП(б)Б, сьведчаць аб фактах псаваньня бульбы ў капцох у радзе раёнаў (Камарынскі, Чачэрскі, Гомельскі, Веткаўскі, Брагінскі і інш.).**

**ЦК КП(б)Б бачыць у гэтым яўную пагрозу зрыву рабочага забясьпячэньня і кармовай базы жывёлагадоўчых гаспадарак.**

**ЦК КП(б)Б прапануе райкомам і РВК пад асабістую адказнасьць сакратароў РК

# У АБСТАВІНАХ ЖОРСТКАЙ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ, У ЗМАГАНЬНІ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

## Слуцкая партарганізацыя да сваёй 8-ай канфэрэнцыі дабілася вялікіх посьпехаў у разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі

## Вышэй тэмпы барацьбы!

Слуцкі раён зьяўляецца адным з буйнейшых жывёлагадоўчых раёнаў БССР. Партыйная арганізацыя Случчыны ў 3 рашаючым годзе пяцігодкі забясьпечыла круты пералом на фронце разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Замест 19, якія меркаваліся па пляне, арганізаваны 23 МТКФ. Камплектаваньне іх выкавана на 114,6 проц. Замест 73, вызначаных плянам, арганізавана 75 фэрм сьвінагадоўчых. Гэтыя лічбы гаворань аб тых посьпехах, з якімі Слуцкая партарганізацыя падышла да сваёй 8-й канфэрэнцыі. Іх партарганізацыя дасягнула, перамагаючы шалёнае супраціўленьне кулацтва пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў да ўхілаў ад бальшавізму.

Бязумоўна, гэтыя посьпехі маглі-б быць яшчэ большымі, калі-б усе партыйныя ячэйкі поўнасьцю скарысталі наяўныя магчымасьці, калі-б усе ячэйкі перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай, з новымі зьдачамі.

8-я канфэрэнцыя зьбіраецца ў момант, калі краіна Саветаў, завяршыўшы пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, уступіла ў 4-ы, заключны год пяцігодкі. Праграма далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі с.-гаспадаркі ставіць яшчэ больш складаныя, яшчэ больш адказныя задачы.

Першая і асноўная з гэтых задач — дабіцца арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, павышэньня калгаснай вытворчасьці. Ва ўсёй суме мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — арганізацыя працы — зьяўляецца важнейшым зьвяном. Задача партыйнай арганізацыі — дабіцца **ўкараненьня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, павесьці больш паглыбленае змаганьне з ураўнілаўкай.** У кожным калгасе, саўгасе, на кожнай калгаснай фэрме праца павінна быць арганізавана так, каб яна стымулявала тэмпы і якасьць работы кожнага калгасьніка.

Партыйная канфэрэнцыя павінна мабілізаваць усю партарганізацыю на павышэньне якасьці работы па разьвіцьці жывёлагадоўлі. Разам з выкананьнем намечаных плянаў барацьба за якасьць набывае першараднае значэньне. Разгортваючы камплектаваньне скотных двароў, сьвінарнікаў, саўгасаў і калгасных фэрм, задача кожнай парт'ячэйкі мабілізаваць масы на барацьбу са стратамі ў жывёлагадоўлі, асабліва па лініі гадоўлі маладняка.

Рэалізаваць поўнасьцю гэтыя вытворчыя задачы партарганізацыя здолее толькі **пры ўмове поўнай перабудовы сваёй работы**, перанёсшы цэнтр цяжару ле ў нізавое вытворчае зьвяно (фэрма, аддзяленьне, брыгада), пры ўмове павышэньня авангардная ролі камуністаў па вытворчасьці.

Аўладаньне тэхнікай жывёлагадоўлі — абавязак кожнага камуніста і камсамольца. Гэтаму вучастку работы неабходна аддаць максымум увагі.

Партыйная канфэрэнцыя, падагульваючы сваю работу, павінна ўзброіць усю партарганізацыю бальшавіцкай непрымірымасьцю да ўсякіх скажэньняў партыйнай лініі, павінна даць жорсткі адпор усялякім праяўленьням апартунізму, якімі-б маскамі ён не прыкрываўся. Вядучы змаганьне за поўнае выкананьне намечаных плянаў, партыйная арганізацыя павінна ўзмацніць работу па выхаваньні калгасьнікаў, павінна шырэй разгарнуць сваё змаганьне з правым апартунізмам, «лявацкімі» загібамі, з праяўленьнямі дробна-буржуазных кулацка-рвацкіх тэндэнцый у калгасах.

Партыйная арганізацыя дабілася перавыкананьня плянаў здачы (продажу) дзяржаве малочнай прадукцыі МТФ. Задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць масы і з такім-жа посьпехам **выканаць пляны збожжазагатовак на працягу бліжэйшых-жа дзён**, дабіцца поўнага выкананьня ўсімі калгасамі і саўгасамі сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Слуцкая райпартарганізацыя падыходзіць да сваёй канфэрэнцыі з радам посьпехаў і на фронце пацыянальна - культурнага будаўніцтва. Аднак, гэтыя посьпехі яшчэ далёка невыстарчальны. Задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць масы на бязьлітаснае змаганьне супроць праяўленьняў ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на даным этапе, супроць ухілу да беларускага шавінізму і шавінізмаў іншых колераў. Да XIV-га зьезду КП(б)Б кожная парт'ячэйка павінна шырока распрацаваць пастанову бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў пацыятыньні. Канфэрэнцыя павінна даць глыбокі аналіз тэй рабоце, якая праведзена па рэалізацыі дырэктыў партыі аб пачатковай і сярэдняй школе.

Канфэрэнцыя павінна мабілізаваць творчую энэргію мас на барацьбу з усякімі ўхіламі і скажэньнямі рэвалюцыйнай тэорыі і практыкі, на барацьбу з апартунізмам, «лявацкімі» загібамі, з трацкісцкай кантрабандай і гнілымі лібэральнымі адносінамі да ўхілаў ад бальшавізму. Яшчэ нічыльней згуртаваўшыся вакол ЦК КП(б)Б і ленінскага ЦК УсеКП(б), Слуцкая партарганізацыя павінна яшчэ з большай настойлівасьцю ажыцьцяўляць тыя задачы, якія пастаўлены перад ёю КП(б)Б.

## Дэкларацыйнасьць замест баявой работы

**Амгозіцкая парт'ячэйка** яшчэ не пазбавілася тварам да калгаснай вытворчасьці, не пераключылася на барацьбу за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы — на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. План укамплектаваньня малочных фэрм ня выкананы. Ячэйка абмяркоўвала гэта пытаньне на сваім сходзе, аднак далей выясненьня пастановы справа ня зрушылася.

Прэміяльна-прагрэсіўная аплата працы ў пераважнай большасьці сьвінагадоўчых таварных фэрм ня ўведзена. Сакратар парт'ячэйкі тав. **Зяньковіч** імкнецца вытлумачыць гэта тым, што «фэрмы да пераводу на зьдзельшчыну яшчэ не падрыхтаваны». Вучот працы ў СТФ пастаўлен дрэнна, абязьлічка не ліквідавана.

Буйнейшым недахопам у рабоце сьвінагадоўчых фэрм зьяўляецца тое, што кармы не перададны пад асабістую адказнасьць загадчыкаў фэрм. З гэтай прычыны выдаткаваньне кармоў праводзіцца вельмі нерацыянальна. Абязьлічка ў выдаткаваньні кармоў у калгасе «Чырвонае сяло» прывяла да таго, што ўжо ў пачатку сьнежня больш паловы кармоў было скормлена.

Ячэйка ня кіруе разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

У паасобных калгасах сельсавету («Батрак», «Краіна саветаў») ёсьць рад дасягненьняў у справе ўвядзеньня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і г. д. Аднак, ячэйка ня ўжыла мер, каб гэтыя дасягненьні замацаваць, каб вопыт перадавых калгасаў перанесьці ў тыя гаспадаркі, дзе зрываецца вытворчы плян. **Янцэвіч.**

## Першыя посьпехі

Барацьба за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі на аснове арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў была пастаўлена ў цэнтры ўвагі **партыйнай ячэйкі калгасу імя Леніна** (Слуцкі раён). Яшчэ ў пачатку сьнежня плян укамплектаваньня малочна - таварнай фэрмы калгасу быў перавыкананы. Замест 80 кароў, якіх меркавалася паставіць па пляне, 10-га сьнежня ў калгасе было ўжо 88. Усё стада буйной рагатай жывёлы даведзена да 140 штук.

Плян здачы таварнай прадукцыі калгасам перавыкананы. Калгас павінен быў здаць 40 тон прадукцыі, але, дзякуючы правільнай арганізацыі работы, да 10-га сьнежня калгасная фэрма здала 40,4 тоны.

Асаблівыя посьпехі дасягнуты ячэйкай у справе выкананьня пляну збожжазагатовак. Усе калгасы Ленінскага сельсавету, за выключэньнем калгасу імя Карла Маркса, пляны загатовак перавыканалі. Найбольш ударнымі тэмпамі прайшла гэта работа ў калгасе «Леніна», які замест 20 тон здаў дзяржаве звыш 50 тон збожжа. Амаль усе калгасьнікі прымалі актыўны ўдзел у правядзеньні збожжазагатовак. Рад калгасьнікаў (Шарупіч М., Бахта Н., Ярмола В. і іншыя) падалі заявы ў праўленьне калгасу аб вылучэньні з зароблёнай імі часткі ўраджаю пэўнай колькасьці для здачы дзяржаве.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты ячэйкай на аснове перабудовы сваёй работы па - новаму, на аснове рэалізацыі ўказаньняў тав. **Сталіна**. Асаблівай увагі заслугоўваюць тыя мэтады работы, якія былі ўжыты ячэйкай у часе правядзеньня збожжазагатовак. Штодзенка сельсавету і калгасу з дня ў дзень давала разгорнуты малюнак ходу загатовак, папулярызавала ўдарнікаў здачы, бязьлітасна выкрывала клясавы твар зрыўшчыкаў загатовак.

Рашаючую ролю ў правядзеньні загатовак адыграла правільная расстаноўка сіл і шырокаразгорнутая масавая работа.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што партыйная ячэйка ня выкарыстала ўсіх магчымасьцяй для арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Якасьць вучоту працы застаецца нездавальняючай. Паасобныя брыгадзіры (Кашанская Т. і інш.) дапусьцілі пры вучоце працадзён грубыя памылкі, што перашкаджала правільнаму разьмеркаваньню даходаў і ўраджаю. Партыйная ячэйка яшчэ дагэтуль не дабілася ўвядзеньня зьдзельшчыны на ўсіх вучастках калгаснай вытворчасьці. Пасьцепныя газэты ня былі мабілізаваны на разгортваньне шырокай работы па арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні калгасаў.

Ленінская парт'ячэйка павінна ўлічыць усе гэтыя недахопы ў сваёй рабоце і пераакладна разгарнуць падрыхтоўку да XIV зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі УсеКП(б).

**Ц. Я.**

# Чарговыя задачы партыйна-палітычнай работы ў часьцях ПА і войск АДПУ

## (З дакладу нач. палітаддзелу УППА і войск ДПУ тав. РАМАНЕНКА)

На рэгіянім пасяджэньні канфэрэнцыі 7-га студзеня выступіў з дакладам **аб чарговых задачах партыйна-палітычнай работы ў пагранахове і войсках ДПУ акругі тав. РАМАНЕНКА.**

— Вузлавыя задачы работы нашай канфэрэнцыі, — кажа тав. Раманенка, — вузлавыя задачы работы парт-арганізацыі пагранаховаы выразна акрэсьлены ў прамове начальніка палітаддзелу ГУПА і войск ДПУ СССР тав. **Рашаля**. Сучасныя ўмовы патрабуюць умоўня па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць, патрабуюць напружанай выразнай работы нашых партарганізацый па выкананьні ўсіх задач партыі.

Наша партарганізацыя разам з усёй партыяй вяла бязьлітасную барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левага» апартунізму і прымірэнцтва. У гэтай барацьбе парт-арганізацыя пагранаховаы і войск АДПУ акругі яшчэ больш загартавалася і падышла да сваёй першай канфэрэнцыі ідэалітычна здаровай і ўстойлівай. Сваёй бальшавіцкай работай на шпа партарганізацыя забясьпечыла вялікія дасягненьні ў справе чэкісцка-баявой падрыхтоўкі і палітычнага выхаваньня чырвонаармейскіх мас.

Аднак, гэта характарыстыка стану партарганізацыі не выключае сабою наяўнасьці ў паасобных яе вызьненьнях прытушленьня клясавай пільнасьці, наяўнасьці выпадкаў гнілога лібэралізму да праяўленьняў апартунізму. На працягу доўгага часу ў адным з нашых партарганізацый апартуніст **Цярэнцеў** беспакарана праводзіў антыпартыйную работу. Зразумела, што паводзіны Цярэнцева, як кулацкага агента ў радах партыі, не маглі ня быць вядомымі для тэй партарганізацыі, у складзе якое ён знаходзіўся. Але кіраўніцтва гэтай партарганізацыяй не праявіла належнай рашучасьці, сваячасова не рэагавала на яўнае праяўленьне апартунізму. І толькі тады, калі прыехаўшы на месца, прадстаўнік палітаддзелу выкрыў гэты факт, толькі тады гэты апартуніст быў выключан з партыі.

Павышэньне клясавай пільнасьці да ўсіх і ўсякіх праяўленьняў апартунізму, да вылазак трацкісцкай кантрабанды і гнілога лібэралізму — задача ў нашай далейшай рабоце.

За мінулы год наша партарганізацыя значна вырасла за лік перадавой часткі рабочага ядра ў асабовым складзе. Павялічылася ўдзельная вага чырвонаармейцаў у складзе арганізацыі. Работа па вярбоўцы ў партыю шчыльна падышлі да актуальнейшай задачы аўладаньня тэхнікай. Неабходна зараз замацаваць рэзультаты агітацыйна-прапагандысцкай работы вакол гэтага пытаньня.

Тав. Раманенка.

Трэба памятаць, што ўменьне кіраваць машынай, матацыклам і страляць з кулямёта — гэта яшчэ ня ўсё тое, што патрэбна для асваеньня тэхнікі. Начальніцкі склад павінен ведаць ня толькі тэхніку ўзбраеньня сваіх падраздзяленьняў, а і ўмець правільна карыстацца, правільна ўжываць яе.

Рост актыўнасьці чырвонаармейскіх мас знайшоў яркае адлюстраваньне ў найпярэйшым разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Асабовы склад пагранаховаы і войск на 100 проц. ахоплен індывідуальнымі дагаворамі, 80 проц. складу зьяўляецца ўдарнікамі. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва сапраўды стала асноўным мэтадам усёй нашай работы.

Побач з гэтым неабходна адзначыць, што не ва ўсіх яшчэ вызьненьнях партарганізацыі выстарчальна вядзецца барацьба з ілжэ-ўдарніцтвам і трасакатнёй. **Ударнік — гэта сапраўдны перадавік тэхнікі і якасьці нашай работы.** На аснове сацспаборніцтва неабходна дабіцца больш якаснай работы па давядзеньні плянаў заняткаў да чырвонаармейца шляхам глыбокай рэтлумачальнай работы і канкрэтызацыі задачы.

У справе баявой падрыхтоўкі вельмі важнае значэньне набыла рацыяналізатарская работа. За мінулы год мы мелі валя 5.000 прапаноў. Але справа ня толькі ў колькасьці, галоўнае ў якасьці гэтых прапаноў, іх рэалізацыі і эфэктыўнасьці.

У заключнай частцы сваёй прамовы тав. **Раманенка** спыніўся на задачах работы партарганізацый пагранаховаы ў вёсцы і больш актыўнага ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР. Тав. Раманенка выступіў задачу абавязкова **вывучэньня камуністамі і начскладам беларускай мовы**, прасякненьня агітгасавай работы пытаньнямі нацыянальна-культурнага будаўніцтва, шырокага распаўсюджаньня ў часьцях беларускай літаратуры, газэт і, ў першую чаргу, ЦО КП(б)Б — газэты «Зьвязда».

## На раённых партканфэрэнцыях

**ЖЛОБІН.**

Адкрылася XIV Жлобінская райпартканфэрэнцыя. Першы заслухан палітычны даклад ЦК КП(б)Б.

У часе абгаварэньня дакладу ЦК калгасьнікі раёну прыбылі вітаць канфэрэнцыю. Ад імя калгасьнікаў «Рагь ёету-Перамоскца» тав. **Гаспадарэнка** разгартуе канфэрэнцыі аб поўным выкананьні загатовак і перавыкананьні плянаў здачы прадукцыі жывёлагадоўлі (плян выканан на 109 проц.). У падарунак канфэрэнцыі калгас аддаткова здаў 10 цэнт. каналеті і 6 цэнт. ільнавалакна.

Прадстаўнік калгасу «Вольная праца» разгартуе канфэрэнцыі аб выкананьні пляну збожжазагатовак на 140 проц. і паведамляе аб тым, што дадаткова здае 55 цэнт. збожжа.

Чырвоныя абозы прыбываюць з розных калгасаў раёну. **В.**

**ВОРША.**

5 студзеня адкрылася раённая партканфэрэнцыя. З дакладам ЦК КП(б)Б выступіў тав. **Чарвякоў.**

Пасьля дакладу канфэрэнцыю вітаюць рабочыя делегацыі чыгуначнікаў і прадстаўнікі чырвонаармейскіх часьцей.

У прывітальнай тэлеграме ЦК КП(б)Б канфэрэнцыя запэўнівае Цэнтральны Камітэт, што па-бальшавіцку вырашыць тыя пытаньні, якія стаяць у парадку дня яе работ, і яшчэ больш мабілізуе масы камуністаў на барацьбу супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў. (БЕЛТА).

**КАМАРЫН.**

Скончыла свае работы рабочая партканфэрэнцыя Камарынскай арганізацыі. Канфэрэнцыя ўсю сваю работу праводзіла пад знакам мабілізацыі мас на барацьбу з усякімі ўхіламі ад лініі партыі, пад знакам шырокага разгорнутай самакрытыкі.

Па дакладу ЦК КП(б)Б выступіла больш 20 делегатаў і па справаздачы райкому—каля 40 таварышоў.

Канфэрэнцыя адзнадушна ўхвалила палітычную лінію ЦК КП(б)Б і памеціла канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на поўную рэалізацыю тых задач, якія на даным этапе ставіць партыя. **П. К.**

## Узорная работа

Латыгольская парт'ячэйка (Сеньненскі раён) асноўную ўвагу сканцэнтравала па задачах арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і пра вядзеньня гаспадарча - палітычных кампаній. Разгортваньнем шырокай масавай работы парт'ячэйка забясьпечыла значныя посьпехі.

План мабілізацыі сродкаў выкананы на 100,2 проц. Збожжазагатоўчыя пляны таксама поўнасьцю выкананы.

Найбольш узорныя прыклады работы паказвае калгас «Латыголь». Малочна-таварная фэрма калгасу ўкамплектавана стадам на 120 проц. Заданьне па здачы (продажы) дзяржаве зрабіла перавыкананым. Калгасам здана 120 цэнт. збожжа, што складае 100 проц. плянавага заданьня.

Дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах, умяшаньню зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і рашучай барацьбе з кулацкімі тэндэнцыямі, калгас «Латыголь» зьяўляецца найбольш моцным і паказальным у гаспадарчых адносінах сярод начальных калгасаў. Парт'ячэйка калгасу расставіла свае сілы з такім разьлікам, каб забясьпечыць узмацненьне свайго ўплыву на асноўных вучастках работы ўзбуйненага калгасу.

**Б. ЗЭЛЬЦЭР.**

Дэлегаты канфэрэнцыі.

*Бугроў*

# Паказальнікі нашых перамог

**Слуцкая** райпартканфэрэнцыя да сваёй чарговай 8-ай канфэрэнцыі падыходзіць з радам станоўчых паказальнікаў на ўсіх вучастках сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Вядучы непрымірымае змаганьне на два фронты — супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў да ўхілаў ад лініі партыі, арганізацыя дабілася таго, што да 62 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну аб'яднаны ў калгасы. На аснове разгортваньня калектывізацыі з посьпехам ліквідуецца кулацтва як класа. Гэтыя посьпехі стварылі новую абстаноўку для работы арганізацыі. **Зараз яе цэнтральнай задачай зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

Падыходзячая 8-я райпартканфэрэнцыя і павінна будзе падагульніць работу партыйнай арганізацыі па ажыцьцяўленьні гэтай асноўнай задачы, работу па правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній, на аснове шырока разгорнутай самакрытыкі ўскрыць тыя недахопы, якія мелі месца ў гэтай рабоце.

Мінулы год быў годам напружанага змаганьня партарганізацыі за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Канкрэтныя паказальнікі выразна гавораць аб тым, што парт-арганізацыя ў справе разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі атрымала значныя перамогі. Зусім ясна, што гэтыя перамогі зьяўляюцца толькі пачаткам тэй вялікай работы, якую павінна правесьці партыйная арганізацыя.

Больш паловы — 66 проц. усіх калгасаў зьяўляюцца жывёлагадоўчымі. Перад раёнам была пастаўлена задача — арганізаваць 19 малочна-таварных фэрм. Гэта заданьне партыі і ўраду Случкай арганізацыяй перавыканана. **Замест 19 арганізаваны 23 фэрмы. Плян камплектаваньня іх выкананы на 114,6 проц.** (замест 1.440 штук пастаўлена 1.708 дойных кароў). Калгасы **імя 1-га мая, Леніна, імя Карла Маркса** далі сапраўды бальшавіцкія ўзоры работы па камплектаваньні фэрм.

Сьвінагадоўля — адна з важнейшых галін сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Перад партарганізацыяй была пастаўлена задача — арганізаваць 73 сьвінатаварныя калгасныя фэрмы. **Арганізавана-ж 75 фэрм, у якіх пастаўлена 3.813 сьвінаматак. Агульная колькасьць сьвіней у калгасах складае 6.444 шт.**

У адпаведнасьці з разьвіцьцём жывёлагадоўлі вымяніліся і суадносіны пасеву розных культур у бок пашырэньня кармовай базы. Плян пасеву бульбы за мінулы год з 14 узьняўся да 21 проц. у адносінах да ўсяго пасеву, кармовых траў — з 18 да 22 проц. і тэхнічных культур — з 2 да 4 проц.

Як-жа калгасы выканалі свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай?

Калі ў мінулым годзе калгасы здалі малочнай прадукцыі (у перавозе на малако) 606 тон, дык у 1931 г. — 2.510 тон. **Сваё заданьне малочныя калгасныя фэрмы выканалі на 112 проц.**

Перад раёнам была пастаўлена задача — здаць дзяржаве 2.754 цэнтн сьвінатаварнай прадукцыі. КСТФ па становішчы на 20 сьнежня выканалі свой плян на 66 проц. і паставілі на адкорм 768 сьвіней.

Упераадзе па здачы таварнай прадукцыі ідуць калгасы **«Камбайн», «Батрак» і «1-га мая».** Гэтыя калгасы за ўзорную работу па камплектаваньні сьвінагадоўчых таварных фэрм і продажу прадукцыі па ўсесаюзнай і ўсебеларускай парадзе па разьвіцьці жывёлагадоўлі прэміяваны.

Калгасны сэктар раёну, перамагаючы дробна-буржуазныя, кулацка-рвацкія і спажывецкія тэндэнцыі, да 20 сьнежня выканаў плян збожжазагатовак на 108 проц.

Гэтыя посьпехі набыты ў жорсткай клясавай барацьбе супроць кулацтва, супроць яго агентуры — правых апартуністаў, супроць «левых» загібаў і ўсялякіх скажэньняў партыйнай лініі. Партыйная арганізацыя, ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі наносіла рашучы ўдар па апартуністах усіх колераў, выкрывала апартуністычную практыку, якая мела месца ў асобных ячэйках. Кіраўніцтва **Амгозіцкай ячэйкі** баявую работу падмяніла апартуністычнай стаўкай на самадзёк. Райком даў жорсткі адпор апартуністам, распусьціў бюро ячэйкі і яго кіраўніка прыцягнуў да партыйнай адказнасьці.

Кіраўніцтва **Казяніцкай парт'ячэйкі** ў пагоні за кутыні процантамі калектывізацыі выпусьціла з-пад увагі вуалавую задачу — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Гэта ячэйка, замест разгортваньня палітычна-масавай работы вакол загатовак, стала на шлях давяз еньня цьвёрдых заданьняў да сераднякіх гаспадарак. 20 проц. усіх гаспадарак сельсавету атрымалі цьвёрдыя заданьні. Раённае партыкіраўніцтва сваячасова выкрыла «лявацкую» практыку Казяніцкай ячэйкі, зьняло яе кіраўніцтва і кіраўнікоў сельсавету.

Перад партыйнымі ячэйкамі і ўсёй раённай арганізацыяй у цэлым стаіць задача — **арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваць калгасы, дабіцца павышэньня калгаснай вытворчасьці.** Для пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтай цэнтральнай задачы калгаснага руху ў раёне ёсьць усе магчымасьці. Справа-заключаецца ў тым, каб усе ячэйкі скарысталі гэтыя магчымасьці, каб яны разгарнулі баявую работу **па ўкараненьні зьдзельшчыны, па арганізацыі ўліку і правільным разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю па прынцыпе — хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае.**

Адзін з важнейшых вагароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў — зьдзельшчына яшчэ ня ўсюды ва ўсе віды работ укаранілася ў калгасах. Паводле вестак райкалгасаюзу з 174 калгасаў раёну на зьдзельшчыну пераведзена 159 калгасаў (91 проц.).

Ці так гэта на справе?

Треба яўсім адкрыта сказаць, што ў радзе калгасаў зьдзельшчына ўведзена фармальна, улік працы пастаўлен неадэкватна. У некаторых калгасах улік працы праводзіцца ня згодна выкананьня нормы выпрацоўкі, а пагадзінна. Гэта гаворыць аб тым, што лічба 91 проц. не характарызуе сапраўднага становішча ўвядзеньня зьдзельшчыны.

У 130 калгасах праведзена папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю. Яно паказала, што масы калгасьнікаў далёкам стаяць за разьмеркаваньне ўраджаю па колькасьці і якасьці затрачанай працы.

Пры правядзеньні гэтай работы ў асобных калгасах мелі месца і яўныя скажэньні дырэктыў партыі і ўраду («Чырв. зорка», «Чырвоны маяк 2», «Хваля рэв.» і інш.). Факты скажэньня партыйных установак у разьмеркаваньні ўраджаю мелі месца таму, што парт'ячэйкі гэтых калгасаў недаацанілі палітычнага значэньня мерапрыемства, якое мае правільнае разьмеркаваньне ўраджаю. Рад ячэек не паставілі канкрэтна гэтага пытаньня на сваіх сходах ці бюро, абмежаваліся толькі растлумачальнай работай сярод калгасьнікаў. Партыйная ячэйка калгасу «Чырвоны маяк» дапусьціла грубую палітычную памылку ў тым, што не забясьпечыла правільнага зваёваньня калгасьнікаў. Некаторыя з іх, якія маюць вялікую колькасьць працадзён, атрымлівалі звыш столькі-ж, а то і менш за тых, якія столькі дзён ня выпрацавалі.

Асноўная колькасьць калгасаў раёну спецыялізуецца ў кірунку разьвіцьця жывёлагадоўлі. Гэта з асаблівай настойлівасьцю дыктуе неабходнасьць неадкладнага ўведзеньня зьдзельшчыны ў калгасах, ліквідацыі абязьлічкі як уداгаднае жывёлы, так і на другіх вучастках работы. Задача партыйных ячэек заключаецца ў тым, каб з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю, на аснове рэалізацыі прамовы тав. Сталіна па нарадзе гаспадарнікаў, дабівацца ўкараненьня зьдзельшчыны і ліквідацыі абязьлічкі.

Барацьба за якасьць работы, за высокія якасныя паказальнікі калгаснай вытворчасьці — адна з вузлавых задач, што стаяць перад партыйнымі ячэйкамі. Неабходна дабіцца, каб кожны калгас у чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі даў сапраўды бальшавіцкія ўзоры змаганьня за вырашэньне адной з важнейшых праблем — праблемы жывёлагадоўлі.

Случкі раён за мінулы год атрымаў пазітыўнай зялёную дапамогу ад пралетарскай дзяржавы. Апрача пазыкі ў 657 тыс. руб., апрача арганізацыі МТС, якая адыгрывае вельмі вялікую ролю ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі раёну, калгасы ўзброены с.-г. машынамі. У 53 калгасах, што абслугоўваюцца МТС, вытворчая работа мэханізавана на 23 проц. Задача кожнага камуніста заключаецца ў тым, каб на аснове магутнай тэхнічнай базы, падведзенай пад сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, на аснове аўладаньня тэхнікай жывёлагадоўлі дабіцца павышэньня таварнасьці кожнага калгасу.

Ажыцьцяўленьне тых складаных задач, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй, немагчыма без карэннай **перабудовы работы і кіраўніцтва ў адпаведнасьці з новымі задачамі.** У гэтым кірунку Случская арганізацыя рад мерапрыемстваў правяла. Справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых партарганаў, якая нядаўна скончана, зьявілася магутным фактарам у перабудове партыйнай работы, у правільнай расстаноўцы сіл. Калі да перавыбараў было толькі дзьве калгасныя ячэйкі, дык зараз іх налічваецца 18, замест 3 саўгасных ячэек зараз — 5. Рэарганізацыя ячэек праводзілася на вытворчым прынцыпе. Але гэта толькі пачатак тэй вялікай работы, якую належыць правесьці райпартарганізацыі. Кожная ячэйка павінна дабіцца правільнай расстаноўкі партыйных сіл, пранізаць увесь змест сваёй работы вырашэньнем пытаньняў вытворчага характару.

Пры наяўнасьці таго пералому, які зроблен у перабудове партыйнай работы, у арганізацыі ёсьць такія ячэйкі, што яшчэ зусім не пачалі перабудоўвацца (Некрашоўская, Грэская, калгасу «Чырвоны маяк» і інш.), не займаліся пытаньнем правільнай расстаноўкі партыйных сіл. Гэтым ячэйкам на аснове перабудовы трэба неадкладна дабіцца павароту тварам да вытворчасьці.

За апошні год партыйная арганізацыя значна вырасла як за лік сельска-гаспадарчых рабочых, так і перадавых калгасьнікаў, якія ў барацьбе з кулацтвам давялі сваю адданасьць генэральнай лініі партыі. Гэта пакапаўненьне павінна атрымаць бальшавіцкае выхаваньне.

Падыходзячая канфэрэнцыя будзе азбываца, калі краіна Саветаў уступіла ў чацьвёрты, заключны год пяцігодкі. Таму задача канфэрэнцыі заключаецца ў тым, каб на аснове бальшавіцкага вырашэньня пытаньняў, што стаяць у парадку дня, яшчэ больш мабілізаваць масы на барацьбу за генэральную лінію партыі, за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі, на барацьбу за новыя перамогі калгаснага будаўніцтва.

# ГОД РАБОТЫ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ У БССР

Бурны рост сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва даў магчымасьць партыі і ўраду шырока разгарнуць справу тэхнічнага ўзбраеньня сельскай гаспадаркі. Пабудова трактарных гігантаў (Сталінградзкі і Харкаўскі заводы, трактарнага цэху «Чырвоны путыловец») мы падвялі машынную базу пад буйную сацыялістычную сельскую гаспадарку — саўгасы і калгасы.

Новая форма буйной мэханізаванай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі — машына-трактарныя станцыі — зьяўляюцца ня толькі тэхнічнай базай для абслугоўваньня калгасаў, але сродкам арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, далейшага пашырэньня сацыялістычнай перабудовы вёскі, арганізатарамі здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

На палёх БССР працуюць 32 МТС магутнасьцю ў 10.935 кон. сіл. Шпаркае будаўніцтва машына-трактарных станцый у БССР у сваю чаргу выклікала значную машынізацыю і мэханізацыю сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. З пачатку веснавой пасеўнай кампаніі 1931 г. у БССР зведзена прычэпнага інвэнтару і складаных машын па 2.923 тыс. руб. Пабудавана 18 майстэрань бягучага рамонту, 16 майстэрань капітальнага рамонту.

З разьвіцьцём МТС расьце і новы тып с.-г. пралетарыяту. За даволі кароткі час існаваньня МТС ужо маюць 2.874 трактарыстаў і старшых рулявых, 107 мэханікаў, 338 паляводаў брыгадзіраў, 178 сьлесароў і токараў, аўтагенщыкаў і г. д., усяго 3.990 чал.

За мінулы год МТС абслужылі 1.870 калгасаў з агульнай ворнай плошчай у 432.275 гэкт., што складае 27 проц. плошчы калгаснага сэктару. Ня гледзячы на запяжную зіму, веснавую сяўбу машына-трактарныя станцыі правялі з перавыкананьнем плянаў, засеяна 234.702 гэкт., або 103,2 проц. Плян пасеву тэхкультур быў праведзен па плошчы ў 43.816 гэкт. (105 проц. да пляну), або 40 проц. плошчы калгаснага сэктару.

Уборачная кампанія зьявілася экзамэнам у сэнсе замацаваньня тых посьпехаў, якія былі дасягнуты ў часе веснавой сяўбы. Дзякуючы своечасовай і здавальняючай падрыхтоўцы, МТС было ўбрана 92.736 гэкт. азімых —158 проц. пасеўнага і ўборачнага пляну, 171.835 га сенажаняй і сеяных траў—412 проц., 125.037 гэкт. яравых збожжавых—107 проц., 43.600 гэкт. ільну і канапель—105 проц., 46.847 гэкт. бульбы—100,2 проц.

Асеньняя пасеўная праведзена яшчэ з большым посьпехам. Замест 118.388 гэкт. азімымі было засеяна 147.073 гэкт.

Выдатную ролю адыгрываюць машына-трактарныя станцыі ў справе арганізацыі продажу калгасамі дзяржаве таварнай прадукцыі, збожжа і іншых культур. МТС пры дапамозе партыі паказалі сваю здольнасьць быць на перадавых пазыцыях збожжазагатовак. Калгасы ў раёнах МТС здалі дзяржаве 114.000 цэнт. збожжавых культур, або 117 проц. заданьня, прычым роўна ў тэрмін, вызначаны ЦК і СНК.

Аднак, у справе здачы таварнай прадукцыі машына-трактарныя станцыямі ёсьць істотныя хібы, на якіх трэба сканцэнтраваць выключную ўвагу працаўнікоў усёй сыстэмы машына-трактарных станцый. Неабходна безадкладна мабілізаваць усе сілы на ліквідацыю адставаньня ў здачы тэхнічных культур. Плян здачы ільнавалакна выкананы калгасамі МТС на 39,5 проц., па ільнатрасьце—63,8 проц., па ільнасемені—78,6 проц.

У выніку работы машына-трактарных станцый у калгасах, што імі абслугоўваюцца, значна павысілася ўраджайнасьць.

Ураджайнасьць азімых з аднаго гэктара па калгасах МТС дасягае 7,6 цэнт., па іншых калгасах—6,6 цэнт., яравых збожжавых—7,6 цэнт. супроць 6,3, бульбы—95,2 супроць 88 цэнтр., ільнасемя — 2,6 супроць 2,4, ільнавалакна—1,98 цэнт. супроць 1,87. Валавы даход з аднаго гэктара ў калгасах МТС складае 133 руб. супроць 116 руб. па іншых калгасах.

Такавы вынікі работы МТС за мінулы год.

Уступаючы ў другі год дзейнасьці МТС, неабходна ўказаць на рад істотных недахопаў, якія яшчэ зьяўляюцца тормазамі для далейшай барацьбы за колькасныя і якасныя паказальнікі. Адным з буйнейшых недахопаў у рабоце МТС было тое, што ня было ўстаноўлена раёну дзейнасьці МТС. У большасьці выпадкаў раён дзейнасьці МТС папыраўся да межаў адміністрацыйнага раёну. Радыус дзейнасьці замест устаноўленага 10-15 клм даходзіў да 20-35, а ў некаторых выпадках да 45 клм. Гэта прывяло да распыленьня машына-трактарнага парку, зьнізіла процант мэханізацыі і г. д.

Калі МТС дасягнулі значных посьпехаў у выкананьні плянаў асноўных гаспадарча-палітычных кампаній, дык у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў галоўнай на сучасным этапе задачы калгаснага будаўніцтва зроблена яшчэ мала. На зьдзельшчыну пераведзены 23 проц. калгасаў. Улік працы поўнасьцю не наладжан; разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў на 10-га сьнежня зроблена ў 1.390 калгасах, або ў 88 проц. Прэміяльна-прагрэсыўная аплата працы ня ўведзена, асабліва сярод трактарыстаў. У аплаце апошніх ня было цьвёрдай яснасьці, аплата рабілася ў розных МТС па-рознаму: то грашыма, то працаднямі, то і тым і другім. У выніку частка трактарыстаў пападала ў лепшыя ўмовы па аплаце параўнальна з іншымі радавымі калгаснікамі. Побач з гэтым былі выпадкі, калі трактарысты атрымлівалі менш радавых калгаснікаў. Гэта спрыяла цякучасьці трактарыстаў. Абязьлічка ў скарыстаньні трактараў была звычайным зьявішчам.

Буйнейшым недахопам у рабоце большасьці МТС зьяўляецца няпоўнае і нерацыянальнае скарыстаньне машына-трактарнага парку і надзвычай нядбайныя адносіны да расходаваньня гаручага і змазачнага. Трактарны парк меў недагрузку за год: па «Інтэрах» на 25 проц., па «Фардзон-пуцілаўцах» — на 27,5 проц.—замест 2.400 гадзін «Інтэр» працавае 1.779 гадзін, а «Фардзон»—замест 1.800 працаваў 1.306 гадзін. Аднак, сярэдняя нагрузка на адзін трактар у пераводзе на ворыва даволі высокая: па «Інтэры»—446 гэкт., па «Фардзоне»—192 гэкт. Сярэдняя прадукцыйнасьць за 10 гадзін дасягнута па «Інтэры»—78 проц. (2,5 гэкт.), па «Фардзоне»—73 проц. (1,46 гэкт.). Выдаткавана гаручага ў сярэднім па «Інтэры» замест 17 кгр. па гэктар—20 кгр., па «Фардзоне» замест 27,5 кгр.—29,2 кгр. На невыстарчальнае скарыстаньне трактараў і нэканомнае расходаваньне гаручага ўплывала велічыня радыусу МТС, адсутнасьць масавай работы сярод трактарыстаў. У выніку абязьлічкі ў справе эканомнага расходаваньня гаручага былі выпадкі простага яго расьцягваньня

Зусім нездавальняюча ажыцьцяўляецца МТС адно з асноўных указаньняў тав. Сталіна аб укараненьні гаспадарчага разрахунку.

Фінансавае становішча МТС нездавальняючае. Рад МТС дагэтуль яшчэ не спагналі з калгасаў запазычанасьці за работу трактараў. Неэканомна выдаткоўваюцца грашовыя сродкі. Замест спагнаньня з калгасаў сродкаў на куплю спэцвопраткі для трактарыстаў, некаторыя МТС купляюць гэту спэцвопратку самі і крэдытуюць калгасы. Некаторыя раённыя арганізацыі замест дапамогі МТС у мабілізацыі сродкаў, паадварот, перашкаджаюць гэтай справе. Напрыклад, Мсьціслаўскі РВК даў дырэктыву райбанку не перадаваць грошы МТС за здачу калгасамі прадукцыю. МТС, каб не падарвань справу здачы таварнай прадукцыі ў калгасах, якія ёю абслугоўваюцца, прымушана была расплачвацца ўласнымі сродкамі (прыкладна, было выдаткавана каля 40.000 руб.). Усё гэта не дапамагала мабілізаваць грашовыя сродкі, а, наадварот, штурхала МТС на няправільнае скарыстаньне грашовых сродкаў, на парушэньне фінансавай дысцыпліны.

Зараз пачаліся гарачыя дні па падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Машына-трактарныя станцыі павінны ў бліжэйшы час закончыць будаўніцтва майстэрань капітальнага рамонту і іх абсталяваньне, скласьці пляны рамонту трактараў і с.-г. машын як у сябе, так і ў калгасах.

Разгортваньне рамонту ідзе пакуль што надзвычай марудна. У гэтай справе неабходна дапамога з боку цэнтральных органаў, асабліва па забесьпячэньні запаснымі часткамі і рамонтнымі матар'яламі.

Вызначаныя пляны сяўбы ў раёнах МТС (пад лён у 60.000 гэкт., бульбу — 90.000 гэкт., кармовыя травы—17.000 гэкт., сіласныя культуры—10.500 гэкт., гароды—10.000 гэкт.) павінны быць даведзены да кожнага калгасу і забясьпечаны радам агратэхнічных мерапрыемстваў.

На МТС Наркамзэмам ускладзена адказная задача—ня толькі культываваць стараворныя глебы, але ператварыць у ворна-прыгодныя землі ўсе хмызьнякі, пішчы, плошчы з куп'ем, заблочаныя выганы, пералогі і г. д. для таго, каб павялічыць пасеўную плошчу тэхнічных і кармовых культур.

Выключную ўвагу павінны аддаць усе МТС справе падрыхтоўкі кадраў. Неабходна падрыхтаваць і атрымаць ад іншых сыстэм: 250 аграномаў, 52 спэцыялістаў па будаўніцтве, 4.300 трактарыстаў, 618 старшых рулявых, 144 разьвязных мэханікаў, 1.726 калгасных рахункаводаў і г. д. Для выраўнаньня гэтай задачы Белтрактарацэнтрам арганізаваны месячныя курсы для старэйшых мэханікаў, разьвязных мэханікаў, старэйшых рулявых, мэханікаў па с.-г. машынах, рахункаводаў. Прыступлена да арганізацыі курсаў трактарыстаў. Аднак, адна сыстэма МТС з гэтай складанай справай поўнасьцю ня справіцца. Думка некаторых арганізацый, што ўсе кадры павінны падрыхтоўвацца толькі сыстэмай Трактарацэнтру, пры такім бурным росьце МТС, абсалютна няправільная. Сыстэма Наркамасьветы павінна дапамагчы арганізаваць пры ўсіх ПКМ вячэрнія школы для падрыхтоўкі трактарыстаў, як гэта зроблена ў РСФСР.

Зараз на БССР прыступлена да арганізацыі 26 новых МТС, укамплектаваньня іх належнымі кадрамі, вядзецца падрыхтоўчая работа да будаўніцтва і заключэньня дагавораў з калгасамі. У трэцюю бальшавіцкую вясну па палёх БССР будуць працаваць 57 МТС з трактарным паркам магутнасьцю ў 18.000 конскіх сіл. Побач з гэтым прыступлена да праектаваньня новых МТС з такім разьлікам, каб у БССР да канца 1932 году было каля 105 МТС, з трактарным паркам магутнасьцю ў 31.500 конскіх сіл.

Такім чынам, сельская гаспадарка БССР будзе пакрыта магутнай сеткай МТС—апорных пунктаў суцэльнай калектывізацыі. Гэта яшчэ больш паскорыць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, забясьпечыць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і прывядзе БССР да суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове да поўнай ліквідацыі кулацтва як класы.

**Каршакевіч.**

# Перадавікі Менскай электрастанцыі
## мабілізуюцца на ліквідацыю перабояў у рабоце

Артыкул **«Менская электрастанцыя павінна працаваць без перабояў»** («Зьвязда» 21-га сьнежня) сустрэў жывы водгук сярод рабочых электрастанцыі.

Артыкул быў распрацаваны на занятках вячэрняй саўпартшколы, сярод актыву і рабочых.

Ужо прыняты канкрэтныя меры для ліквідацыі недахопаў, адзначаных у артыкуле «Зьвязды». 24-га сьнежня ў выхадны дзень быў праведзен суботнік па дастаўцы цёплавоза з Цнянскіх торфараспрацовак на станцыю.

Зараз падача торфу і проў са двара да пад'ёмнікаў робіцца цёплавозам, а рабочая сіла перакінута на іншыя вучасткі. У мэтах лепшай падачы апалу праведзена генэральная чыстка дваровых шляхоў.

Асабліва адказныя вучасткі ўмацаваны лепшымі рабочымі-камуністамі.

У студзені ўсе цэхі і брыгады будуць пераведзены на гаспадарчы разрахунак, што дасьць магчымасьць ліквідаваць абязьлічку, якая дагэтуль панавала па станцыі.

Зьнят з работы рабочы Мірончык, які, як паведамлялася ў артыкуле, з-за нядбайных адносін да работы, папсаваў падшыпнік помпы.

У «Зьвязьдзе» адзначалася таксама, што нам. загадчыка станцыі Чахоўскі па сходзе заявіў: «Выключэньні тока былі і будуць далей». Гэта выступленьне мы разглядаем, як не бальшавіцкае, як папкёрскае, бо камуніст не павінен пасавацъ перад труднасьцямі.

На электрастанцыі дагэтуль яшчэ не ліквідавана цякучасьць рабочай сілы, асабліва сярод дваровых рабочых.

Мы абвяшчаем сябе мабілізаванымі на барацьбу з недахопамі работы і бярэм на сябе абавязак, пад кіраўніцтвам парткалектыву рашуча змагацца за выкананьне прамфінпляну электрастанцыі, на аснове рэалізацыі 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.

Брыгада рабочых электрастанцыі:
**Майсеевіч, Садоўскі, Л. Грынчук, Гофман, Мядвецкі, Белапусаў і Марцьнкевіч.**

# ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ НЕДААЦЭНЦЫ ВАЖНЕЙШАЙ КАМПАНІІ
## Неадкладна абмалаціць і выканаць плян здачы дзяржаве насеньня кармовых траў

## Далейшая зацяжка—злачынства

Загатоўкі насеньня кармовых траў па-ранейшаму праходзяць чарапашымі тэмпамі. Сучасны ход загатовак нельга інакш кваліфікаваць, як злачынае таптаньне на месцы. Апошняя дэкада, як і мінулая, не дала належнага зруху. Плян загатовак на 1 студзеня г. г. па шматгадовых травах выкананы усяго па 9,4 проц., кораньплодах—на 11,5 проц., а гародніне і бабовых—яшчэ менш.

Важнейшыя насеньнаводчыя раёны, як Койданаўскі, які павінен загатовіць 7.998 цэнт. насеньня, загатовіў толькі 219 цэнт., Смалявіцкі—4.317 цэнт., загатоўлена 13, Пухавіцкі — 14.550 цэнт., загатоўлена 187, Мсьціслаўскі — 3.288 цэнт., загатоўлена 150 цэнт. Такі-ж малюнак і па Церахаўскім, Лёзьнінскім, Брагінскім, Тураўскім і Чырвона-Слабодзкім раёнах.

Прапойскі, Бешанковіцкі, Камарынскі, Каралінскі, Клімавіцкі, Стара-Дароскі і Жлобінскі раёны амаль зусім не прыступілі да загатовак.

Адным з асноўных прычын слабога ходу загатовак трэба лічыць адсутнасьць масавай работы сярод здачлыкаў і бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый. Толькі недаацэнкай гэтай важнейшай кампаніі з боку некаторых раённых арганізацый можна тлумачыць тое, што па 40 раёнах кулацка-заможнымі гаспадаркамі ня здана ніводнага кілё насеньня сэрадэлі, а канюшыны паступіла толькі 400 грам. Мала таго, у радзе месц кулацка-заможныя гаспадаркі яшчэ не атрымалі цьвёрдых заданьняў.

Адначасова зусім слаба праводзіцца масавая работа сярод кантрактантаў. Да гэтага часу сярод значнай часткі аднаасобнікаў яшчэ не праведзена ніякай работы па давядзеньні плянаў у парадку самаабкладваньня.

Пасьля гэтага ня дзіва, што насеньне так марудна паступае на загатоўчыя пункты. Замест арганізацый загатовак некаторыя апартуністычныя элемэнты ўсё яшчэ ня спыняюць гутарак аб нерэальнасьці плянаў. У той час, як у калгасах насенныя травы ляжаць неабмалочанымі, апартуністы з Веткаўскага раёну крычаць аб адсутнасьці насеньня. Усе гэтыя факты зьяўляюцца найлепшай ілюстрацыяй самацёчных настрояў, нежаданьня працаваць па-баявому.

Трэба спыніць апартуністычныя гутаркі аб нерэальнасьці плянаў і пасьці рашучы ўдар па стаўцы на самацёк у гэтай важнейшай кампаніі. Неадкладна арганізаваць абмалот і здачу насеньня траў дзяржаве.

Раённыя арганізацыі павінны памятаць, што БССР зьяўляецца адным з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў Саюзу. Разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі будзе ў значнай ступені залежаць ад стварэньня моцнай кармовай базы. Намечаны пасеў кармовых траў на плошчы 380 тыс. га павінен быць забясьпечан цалкам мясцовым насеньнем.

Далейшая зацяжка загатовак нецярпіма, яна будзе граць толькі на руку клясаваму ворагу, які імкнецца затармазіць пасьпяховае праведзеньне падрыхтоўчай работы да веснавой кампаніі.

## ЗВОДКА БЕЛКАНТОРЫ САЮЗНАСЕННАВОДАБ'ЯДНАНЬНЯ

*аб ходзе загатовак насеньня кармовых траў, кораньплодаў, гародніны і яравых збожжавых па сэктарох БССР на 1 студзеня 1932 году*

| НАЗВА СЭКТАРОЎ | Загатоўлена ў процантах да пляну | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Шматгадовых траў | Кораньплодаў | Гароднины | Бабовых | Збожжавых |
| Дзяржсэктар | 6,77 | 15,6 | 7,3 | — | 9 8,11 |
| Белкалгаснасенсаюз | 13,5 | 8,53 | 3,48 | 6,9 | 22,7 |
| Хлебжывёлсаюз | 1,91 | 8,22 | 0,61 | — | — |
| Ільнаканапляводсаюз | 3,9 | — | — | — | — |
| Садсаюз | 2,9 | 36,0 | 25,6 | 13,2 | — |
| Разам па сэктарох: | 9,4 | 11,3 | 3,37 | 8,39 | 62,83 |

## Да адказнасьці за „очковтирательство"

ВЕТКА. Загатоўкі насеньня кармовых траў Веткаўскай насенканторай да гэтага часу яшчэ не разгорнуты поўным ходам. Тэрміны, устаноўленыя Наркамзэмам, прайшлі 1 студзеня, а плян загатоўкі вікі выкананы усяго толькі на 0,01 проц.—замест 1.655 цэнт. загатоўлена 24, канюшыны на загатоўчы пункт насенканторы не паступіла ні аднаго кілё, а паводле пляну трэба загатовіць 205 цэнт.

Работнікі Веткаўскай насенканторы замест таго, каб арганізаваць масы калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў па хутчэйшае выкананьне пляну, разважаюць, што пляны па загатоўцы насеньня «нерэальныя». І на запытаньне, чаму канторай не загатоўлена ні аднаго кілё канюшыны, а вікі загатоўлена толькі 0,01 проц.,—адказалі: «У нас няма насеньня».

Але факты гавораць зусім іншае. У трох калгасах («Трэці рашаючы», «Чырвоная Беларусь», «Чырвоны баец») насенная віка і канюшына ляжаць у пунях калгасаў неабмалочанымі і, каб абмалаціць іх, можна поўнасьцю выканаць пляны загатовак насеньня кармовых траў.

РК КП(б)Б і РВК Веткаўскага раёну на падставе тэзісаў ЦК КП(б)Б, якая была зьмешчана ў «Зьвязьдзе» ад 1-га студзеня 1932 г., павінны прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў Веткаўскай насенканторы за бязьдзейнасьць і апартуністычныя разважаньні і мабілізаваць усю грамадзкасьць раёну на поўнае выкананьне пляну.

**Я.**

## Аб'ектыўныя прычыны ў апраўданьне сваёй бязьдзейнасьці

ВОРША.

Сыстэмай Садсаюзу па Аршанскім раёне паводле пляну павінна быць загатоўлена 2.401 цэнт. вікі і 529 цэнт. канюшыны. Але тэмпы, якімі працуюць кіраўнікі Аршанскага садсаюзу і райкалгассаюзу, ставяць пад яўную пагрозу зрыву выкананьне пляну загатоўкі насеньня кармовых траў і гародніны. Ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны для загатоўкі насеньня кармовых траў і гародніны прайшлі (1 студзеня), на сёньняшні дзень загатоўлена на раёне вікі 254 цэнт., замест 2.401 цэнт., канюшыны, замест 529 цэнт. — 5,7.

Напрошваецца пытаньне — чаму такі нізкі процант выкананьня пляну загатовак насеньня кармовых траў і хто ў гэтым вінаваты? Старшыня Аршанскага садсаюзу, між іншым, высоўвае чатыры галоўныя прычыны. Першая — у калгасах і саўгасах Аршанскага раёну пануюць спажывецка-кулацкія тэндэнцыі; другая — няма насеньня, г. зн. нерэальныя пляны; трэцяя — ня было пастаўлена пытаньне перад саўгасамі і калгасамі аб своячасовым абмалоце насеньня канюшыны і вікі і чацьвертая — калгасы не здаюць насеньня таму, што ім не даюць за яго праштававаў.

Такім чынам, аршанскія кіраўнікі садсаюзу і райкалгассаюзу, спатыкаўшы труднасьці на шляху загатовак насеньня, пальцам аб палец ня стукнулі, каб арганізаваць калгасныя масы на барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі, якія ёсьць сярод пасобных калгасаў і калгаснікаў Аршанскага раёну, на барацьбу за своячасовы абмалот насеннай вікі і канюшыны і здачу насеньня на загатоўчыя пункты.

Выкоўваючы, як прычыну слабога ходу загатовак насеньня, нерэальнасьць пляну, кіраўніцтва Аршанскага садсаюзу стаіць на чале кулацка-спажывецкіх тэндэнцый і настрояў, якія пануюць сярод часткі работнікаў загатоўчых арганізацый. Свае ўласныя спажывецкія настроі старшыня Аршанскага садсаюзу зусім няправільна імкнецца прыпісаць усім калгасам і саўгасам.

Аршанскай РСІ неабходна зараз-жа разгледзець справу загатоўчых арганізацый раёну і ў першую чаргу кіраўніцтва садсаюзу, якое злачынна тармозіць ход загатовак насеньня кармовых траў і гародніны, і прыпынуць іх да адказнасьці. Саўгасныя і калгасныя парт'ячэйкі павінны шырока разгарнуць масавую работу сярод калгаснікаў, бедноты і серадняковаў—аднаасобнікаў, мабілізаваць іх на барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі, на хутчэйшы абмалот насеннай вікі і канюшыны, на поўнае выкананьне пляну загатоўкі насеньня кармовых траў.

**Я.**

В. САКАЛЕНКА

# Мэталяпрамысловасьць БССР — да XIV зьезду КП(б)Б

На фоне гігантскіх посьпехаў сацыялістычнай прамысловасьці БССР асабліва рэльефна вызначаюцца вялікія дасягненьні рэспубліканскай мэталяапрацоўчай прамысловасьці.

Дзякуючы ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, на аснове жорсткай барацьбы з правымі і «левымі» апартуністамі, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі і настойнаму, напружанаму змаганьню рабочае клясы Савецкай Беларусі за бальшэйшыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, мэталяпрамысловасьць уступае ў чацьверты, заключны год пяцігодкі пад знакам вялікіх перамог. Гэтыя перамогі адыгрываюць выключна важную ролю ў адносінах разгортваньня індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай перабудовы народнай гаспадаркі, у ператварэньні БССР з адсталай аграрнай краіны ў краіну індустрыяльна - аграрную.

Шпаркімі тэмпамі рос аб'ём вытворчасьці. Колькасьць прадукцыі, выпушчанай у 1931 годзе (на 41 млн. руб.), у **10,8 раз перавысшае даваенны ўзровень вытворчасьці** і ў 5 раз прадукцыю 1926-27 г. Лік рабочай сілы, занятай у мэталяпрамысловасьці (у 1931 г.—8.500 ч.) у 6,3 разы перавышае даваенную колькасьць рабочых і ў 2,8 разы лік рабочых 1926-27 г. г. Гэтыя лічбы толькі часткова характарызуюць нашы дасягненьні.

Асноўная зарука нашага далейшага разьвіцьця — гэта тыя буйныя рэканструкцыйныя зрухі, аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, якія за апошнія пяць год зусім зьмянілі твар мэталяпрамысловасьці, ператварылі мэталяпрадпрыемствы з поўсаматужных рамонтных майстэрань у буйныя машына - будаўнічыя заводы, большасьць якіх па сваім маштабе і тэхнічным узроўні набліжаюцца да машына-будаўнічых заводаў агульнасаюзнага значэньня сярэднята тыпу. Замест вырабу прымітыўнага інвэнтару для дробнай індывідуальнай сельскай гаспадаркі і дробных рамонтных работ, якія складалі ў 1926-27 годзе асноўную прадукцыю мэталяпрамысловасьці, **нашы заводы пачынаюць аўладаць тэхнікай масавай і сэрыйнай вытворчасьці складаных машын** для абслугоўваньня ня толькі патрэб БССР, але і Заходняй вобласьці і інш. раёнаў Саюзу.

Значныя посьпехі дасягнуты ў асваеньні тэхнікі вырабу раду машын, якія раней увозіліся з-за межаў. Мэталяапрацоўчыя заводы БССР зараз вырабляюць абсталяваньне для крухмальна-патачнай прамысловасьці (завод імя Варашылава і «Камунар»), для сьпіртна - броварнай прамысловасьці (завод «Пралетары»), будаўнічыя мэханізмы, тарфяное абсталяваньне, сьвідравальныя, такарныя і цэнтравальныя варштаты (завод імя Варашылава), цагельныя агрэгаты і прэсы (завод імя Сталіна, Бабруйск), аптэчныя вырабы (акулярная фабрыка), абутковыя і інш. цьвікі (на заводзе «Чырвоны кастрычнік», Ворша) і, нарэшце, складаныя сельска-гаспадарчыя машыны і трактарны інвэнтар для аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі (заводы «Гомсельмаш» і «Чырвоны мэталіст»).

Гэтыя дасягненьні ў асваеньні вытворчасьці складаных машын паставілі мэталяпрамысловасьць БССР на службу сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі, **узмацнілі эканамічную незалежнасьць краіны** і яе абароназдольнасьць, далі магчымасьць з'эканоміць сотні тысяч рублёў залатой валюты, якія выдаткаваліся на завоз машын з-за межаў СССР.

Асноўны капітал рэспубліканскай мэталяпрамысловасьці (уключаючы на скончанае будаўніцтва) вырас з 4.700 тыс. рублёў у 1927 годзе, да 19.100 тыс. па 1 студзеня 1932 году, г. зн. у 3,8 разы.

**Мэханізацыя і сацыялістычная рацыяналізацыя вытворчых працэсаў суправаджаецца ростам прадукцыйнасьці працы на 80 проц. і зьніжэньнем сабекошту прадукцыі на 24 проц. супроць 1926-27 году.**

Гэтыя посьпехі, дасягнутыя, наперакор шкоднікам, якія імкнуліся сарваць тэмпы разьвіцьця мэталяпрамысловасьці, даюць поўную магчымасьць канстатаваць **выкананьне пяцігадовага пляну па асноўных паказальніках у 1931 годзе.**

Вызначаная паводле пяцігадовага пляну на 1932-1933 г.г. (выключаючы новыя заводы, што меркаваліся да пабудовы) валавая прадукцыя ў 33.217 тыс. р. ужо перавышана ў 1931 годзе і складае 35.280 тыс. руб. Сума капіталаўкладаньняў з пачатку пяцігодкі да канца 1931 году складае 13,9 млн. руб. супроць вызначаных па ўсё пяцігодзьдзе 14,7 млн. руб.

**Такім чынам, пяцігодка выпуску прадукцыі і капіталаўкладаньняў выкананa на 3¼ гады, а пасобныя заводы ўжо далёка апярэдзілі намячэньні пяцігадовага пляну.**

Напрыклад, пяцігадовы плян намячаў, што **завод імя Варашылава** выпрацуе ў 1932-33 годзе валавой прадукцыі па суму 1.657 тыс. руб., між тым, у 1929-30 г. завод выпусьціў прадукцыі на 3.555 тыс. руб. **Завод «Камунар»** выпусьціў у 1929-30 г. г. прадукцыі на 3.044 тыс. руб., вызначалася-ж пяцігадовым планам даць у 1932-33 годзе прадукцыі на 2.275 тыс. руб. Завод **«Гомсельмаш»**, які раней быў разьлічан на выпуск дробнага індывідуальнага сельска - гаспадарчага інвэнтару і потым рэарганізаваны ў завод на вырабе складаных сельска - гаспадарчых машын для калгасаў і саўгасаў, у 1931 годзе выпрацаваў прадукцыі на 8.500 тыс. руб. супроць намячэньня па апошні год пяцігодкі ў 7.699 тыс. Таксама перавыкананы пяцігадовы плян росту зарплаты: ён дасягнуў у 1931 годзе 24 процантаў супроць 1927-28 г., замест 21 проц. паводле пяцігадовага пляну па 32 33 г.

Выкананьне пяцігодкі па асноўных паказальніках за 3¼ гады, далейшае аўладаньне тэхнікай вырабу новых машын, асваеньне новых капіталаўкладаньняў і іх далейшы рост, які дасягнуў у 1931 годзе 5,2 млн. руб., павялічэньне выпуску прадукцыі супроць 1930 году на 27 проц.—характарызуюць работу мэталяапрацоўчай прамысловасьці ў 1931 годзе.

Адказныя задачы, што стаяць перад намі ў 1932 — апошнім годзе пяцігодкі, патрабуюць уважлівага вывучэньня і ліквідацыі пасобных хібаў у рабоце мэталяапрацоўчых заводаў.

У 1931 г. мы не дабіліся поўнага выкананьня плянавых заданьняў. Фактычны выпуск прадукцыі, які складае 41 млн. рублёў, хаця і дае рост супроць 1930 году на 27 проц., раўняецца, аднак, толькі 71% пляну.

Такое значнае недавыкананьне пляну выпуску прадукцыі, якое пацягнула за сабою недавыкананьне якасных паказальнікаў, ні ў якім разе ня можа быць цалкам аднесена за лік аб'ектыўных прычын—перабояў у забесьпячэньні сырцом і г. д. Тут адыгралі вялікую ролю прычыны суб'ектыўнага характару, недахопы арганізацыйна - вытворчага парадку.

Вялікі разрыў паміж выкананьнем пляну ў рабочай сіле (на 94%) і ажыцьцяўленьнем заданьня па выпуску прадукцыі (на 71 проц.), выкананьне пляну ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы на 75 проц. побач з ажыцьцяўленьнем заданьня па зарплаце на 107 проц., зьніжэньне сабекошту на 5,7 проц. супроць прадугледжанага планам на 12 проц.—вось асноўныя адмоўныя моманты ў рабоце мэталяпрамысловасьці ў 1931 годзе.

Рад фактаў сьведчаць аб тым, што ў нас ёсьць усе магчымасьці для лепшага выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў.

На аснове ажыцьцяўленьня шасьці ўказаньняў тав. Сталіна і ўздыму сацыялістычных мэтадаў працы, на многіх прадпрыемствах вызначыўся рэзкі пералом ў выкананьні якасных паказальнікаў. Выпуск прадукцыі па мэталяпрамысловасьці ў другім паўгодзьдзі павялічыўся на 47 проц. у параўнаньні з першым. Ножніцы паміж ростам колькасьці рабочых і выпускам прадукцыі зьменшыліся з 34 процантаў да 24 проц., прадукцыйнасьць працы вырасла на 29 проц. Гэта дасягнута ў выніку ўкараненьня гаспадарчага разрахунку на прадпрыемствах, пераводу цэхаў на новую сыстэму работы, арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад, колькасьць якіх на 1 студзеня дасягае 160 з ахопам 2.200 рабочых, у выніку павышэньня ўдзельнай вагі зьдзельшчыны з 57 да 70 проц., ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі і г. д.

Работа ў другім паўгодзьдзі выявіла вялізарныя рэсурсы і магчымасьці далейшага павышэньня якасьці працы. Скарыстаньне гэтых захаваных рэсурсаў, поўнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна—гэтыя задачы павінны быць пастаўлены ў цэнтры ўвагі ўсіх арганізацый мэталяапрацоўчай прамысловасьці ў 1932 г. годзе.

**Паводле пляну выпуск прадукцыі ў 1932 г. даводзіцца да 50,4 млн. руб.—гэта значыць на 26 проц. больш,** чым у 1931 г. Побач з абсалютным ростам прадукцыі асаблівая ўвага ў пляне 1932 г. адданецца спэцыялізацыі заводаў, прыставаньню іх да больш поўнага задаваленьня першачарговых патрабаваньняў народнай гаспадаркі.

З гэтай мэтай завод «Пралетары» спэцыялізуецца на вырабе абсталяваньня для броварнай прамысловасьці. На заводзе «Камунар» уводзіцца выраб крухмальна - патачнага абсталяваньня, на Гомсельмашы паладжваецца выпуск больш удасканаленых сіласарэзак «Інтэрнацыянал», на заводзе імя Варашылава — выпуск кормазапарнікаў замежнага тыпу для сьвінагадоўчых фарм. Адначасова пашыраецца база рамонтных работ і індывідуальных заказаў на заводах «Чырвоны Адраджэнец» і «Пралетары».

Гэтыя мерапрыемствы павінны ліквідаваць тое становішча, у якое ў мінулым былі пастаўлены асобныя галіны прамысловасьці БССР, калі мэталазаводы, загружаныя вырабам менш важных машын, ня выконвалі першачарговых заказаў для ільназаводаў, хімічнай прамысловасьці і г. д.

**У 1932 г. намячаецца капітальнае будаўніцтва на суму 5 млн. руб.** Гэта сума павінна быць накіравана на скончаньне пачатага ў мінулыя гады будаўніцтва і рэканструкцыю заводаў. **Найбольш рацыянальнае скарыстаньне сродкаў, канцэнтрацыя капіталаўкладаньняў на найбольш адказных вучастках — задачы капітальнага будаўніцтва ў гэтым годзе.**

Паводле пляну ў гэтым годзе павінна быць скончана пабудова асноўных цэхаў заводу Гомсельмаш, кацельнага цэху на заводзе імя Варашылава, мэханічна-зборачнага цэху на заводзе «Камунар» і прыступлена да рэканструкцыі голкавай фабрыкі ў Віцебску з мэтай спэцыялізацыі яе на вырабе голак для панчошна - трыкатажнай і абутковай прамысловасьці, якія зараз увозяцца з-за межаў. Звыш вызначаных у пляне капіталаўкладаньняў у суму 5.000.000 руб. будуецца ва ўдарным парадку і павінен увайсьці ў экспляатацыю ўвесну 1932 г. трубаліцейны завод, які будзе абслугоўваць патрэбы камунальнай гаспадаркі.

Вялізарныя задачы пастаўлены перад намі ў галіне **аўладаньня якасьцю работы.** Павышэньне прадукцыйнасьці працы на 24 проц., зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 10 проц., паляпшэньне якасьці прадукцыі, эканомія мэталю і апалу, барацьба са стратамі, самая шырокая мабілізацыя рэсурсаў прамысловасьці — вось тыя вузлавыя пытаньні, на вырашэньні якіх павінна быць сканцэнтравана ўвага ўсіх гаспадарчых, партыйных і прафэсыянальных арганізацый і ўсёй рабочай грамадзкасьці. Яны могуць быць вырашаны толькі на базе далейшага ўздыму сацпаборніцтва і ўдарніцтва і перабудовы ўсёй вытворчай работ

# ЗА ЦЬЗІНЬЧЖОУ—ШАНХАЙГУАНЬ

## Вароты ў цэнтральны Кітай—у руках акупантаў

### Акупацыя Шанхайгуаня

**МУКДЭН, 7. Японскія войскі занялі Шанхайгуань.**

### Чорны інтэрнацыянал благаслаўляе акупацыю Манчжурыі

ТОКІЕ, 7. Па паведамленьні агенцтва Сімбун Рэнга місіянэр Краўс, пасланы нядаўна папай для азнаямленьня са становішчам у Манчжурыі, выступіў у Мукдэне з прамовай па радыё, у якой заявіў, між іншым, што «необходна прадставіць Японіі мандат на кіраўніцтва Манчжурыяй, а пасьля падрыхтаваць незалежнасьць Манчжурыі пад пратэктаратам Японіі». Краўс указаў, што на думцы каталіцкіх місіянэраў у Мукдэне, нядаўнія дзеньні японскіх войск зьяўляюцца «вялікай кампаніяй ў інтарэсах цывілізацыі».

### Акупанты будуюць аэрадромы

БЭЙПІН. Японскія ўлады пачалі пабудову аэрадрому у новазанятых раёнах па Бэйпіну—Мукдэнскай чыгунцы.

### Нота ПАЗШ Японіі і Кітаю

**ВАШЫНГТОН, 7. Сёньня дзяржаўны сакратар (міністар замежных спраў) Стымсон паслаў Японіі і Кітаю наступную ноту:**

**«У разультаце нядаўніх ваенных апэрацый у раёне Цзіньчжоу была канчаткова пікідавана адміністрацыйная ўлада ўраду кітайскай рэспублікі ў Паўднёвай Манчжурыі ў тым выглядзе, як яна існавала да 13 верасьня 1931 г.**

**З прычыны сучаснага становішча, пры наяўнасьці правоў ПАЗШ і зьвязаных з імі абавязацельстваў, амэрыканскі ўрад лічыць сваім абавязкам указаць як імпэратарскаму японскаму ўраду, так і ўраду кітайскай рэспублікі, што ён ня можа лічыць законным ніякае становішча дэ-факто і ня мае намеру прызнаць ніякіх пагадненьняў згод паміж зазначанымі вышэй урадамі, або іх агентамі, якія (згоды) могуць паставіць пад пагрозу дагаворныя правы Злучаных Штатаў у Кітаі. Амэрыканскі ўрад ня мае намеру таксама прызнаць ніякай сітуацыі, ніякіх дагавароў, або згод, якія супярэчаць агульнай мэце статуту і абавязацельствам парыскага пакту, заключанага 27 жніўня 1927 г., удзельнікамі якога зьяўляюцца як Кітай і Японія, так і ПАЗШ».**

* * *

**ТОКІЕ. Пасол ПАЗШ уручыў ноту Стымсона. У міністэрстве замежных спраў зазначаюць, што НОТА АМАЛЬ ДАСЛОЎНА ПАЎТАРАЕ ВЕРБАЛЬНУЮ НОТУ ПАЗШ ЯПОНСКАМУ ЎРАДУ 13 МАЯ 1915 г. у сувязі з прад'яўленьнем Японіяй Кітаю 21 патрабаваньня. У вербальнай ноце ўрад ПАЗШ зазначыў, што «ніякіх дагавароў, якія парушалі-бы прынцыпы адкрытых дзьвярэй і якімі былі-бы закрануты правы яе грамадзян, Амэрыка не прызнае».**

### Захватам Цзіньчжоў і Суйчжуня японскія задачы не заканчваюцца

БЭЙПІН. Японская газэта «Ніцы-Ніцы» паведамляе з Харбіну, што «заняцьцем Цзіньчжоу і Суйчжуня японскія задачы не заканчваюцца, бо Чжал Сюэ-лян, карыстаючыся падтрыманьнем трэцяй страны (намёк на Англію), можа зноў выступіць і таму японскія войскі павінны працягваць справу ўмацаваньня Манчжурыі і Манголіі.

# Белагвардзейцы рыхтуюць новыя правакацыі

## Японская актыўнасьць пераносіцца на поўнач Манчжурыі

БЭЙПІН, 6. Харбінскія падзеі, кіраўнікамі якіх зьяўляюцца японскія прадстаўнікі, у асаблівасьці зьвязаныя з японскай ваеннай місіяй у Харбіне і з белагвардзейскай газэтай «Харбінскі час», а правакацыйнымі выканаўцамі—белагвардзейцы,—лёгічна і палітычна вынікаюць з усяго ходу падзей у паўночнай Манчжурыі. Са становішча, якое стварылася ў паўночнай Манчжурыі, вынікае ў прыватнасьці японска-белагвардзейская падрыхтоўка да правакацый, якія былі сваячасова выкрыты савецкай прэсай. Гэтыя правакацыі ўвязваюцца з зьмяшчэньнем ад кітайскіх войск рэйну Цзіньчжоу, бо пасьля гэтай апэрацыі японская актыўнасьць зноў пераносіцца на поўнач Манчжурыі для канчаткова падпаракаваньня гэтай часткі краіны японскаму кантролю.

Бліжэйшай мэтай белагвардзейскай правакацыі зьяўляецца дыверсіі і аслабленьне ўплыву ў паўночнай Манчжурыі асоб, зьвязаных з Чжан Сюэ-лянам, і ў першую чаргу тых асоб, якія маюць рэальную сілу (начальнік паліцыі Ван Жун-хуа, камандуючы гарнізонам аховы на КУЧ Дзін-Чжао), в мэтай падпачаленьня іх японскаму ўплыву або замены японскімі стаўленьнікамі.

У сучасны момант белагвардзейцы, паводле ўказаньня японцаў, стварацоць повод і ўмовы для ўводу японскіх войск у Харбін. Калі палітычныя меры будуць невыстарчальны для гэтага, дык зараз інсцэніюецца розалюцыя з патрабаваньнем ад імя «насельніцтва» ўводу японскіх войск «для ратаваньня насельніцтва ад беспарадкаў», якія імі-ж арганізуюцца. Шляхам напісаньня лістовак, падрыхтоўкі тэлеграфных просьб на імя Хоцзіё (галоўнакамандуючы акупацыйнай арміяй) аб хваляваньнях сярод насельніцтва ствараецца псыхалёгічная падрыхтоўка да ўводу японскіх войск у Харбін.

Гэта-ж мае на мэце і папярэдняя думка парады консулаў краін, якія карыстаюцца правам экстэрытарыяльнасьці. У такіх умовах нават адна пагроза ўводу японскіх войск у Харбін зьяўляецца зручным выпадкам да таго, каб кіраўнік асобнага раёну ўсходняй правінцыі Чжан Цзян-гуй мог фарсаваць зьмену апарату і ліквідацыю ўплыву Чжан Сюэ-ляна. (ТАСС).

# Выканком КІМ'у аб правядзеньні кампаніі Ленін—Лібкнэхт—Люксэмбург

Кампанія Ленін-Лібкнэхт-Люксэмбург набывае ў гэтым годзе, асабліва з прычыны разгортваньня падзей за апошнія месяцы, павышанае значэньне. Крыкс капіталізму паглыбіўся і наступленьне прадпрыемцаў выклікае яшчэ больш рэзкае пагоршаньне ўмоў жыцьця рабочай клясы. У працяжу зацяжнога капіталізму мы бачым у Савецкім Саюзе ўсьдым і ажыцьцяўленьне ўсіх пляновых заданьняў сацыялістычнага будаўніцтва. Буржуазія ўсё больш рашуча скідае «дэмакратычную» вопратку і пераходзіць да застасаваньня ўсё больш вострых мэтадаў тэрору, якім ажыцьцяўляюцца палітычны і фашысцкімі бандамі наймовых забойцаў. Лік краін, у якіх буржуазія падрыхтоўвае адкрытую фашысцкую дыктатуру, усё павялічваецца.

У такіх умовах неабходна ўзмоцнена правядзіць вузьлоўе найлепшага спадчыны сусьветнага пралетарыяту—вучэньне Леніна. У якасьці галоўнай задачы, у сувязі з кампаніяй трох Л (Ленін-Лібкнэхт-Люксэмбург), стаіць задача арганізацыі баёў пралетарскай моладзі за яе штодзённыя патрабаваньні—адзіны рэвалюцыйны выхад з крызісу. Таму масы пралетарскай моладзі павінны ў гэтым сэнсе ўсвоіць пераданы Розай Люксэмбург вопыт палітычнай масавай забастоўкі, узяты з урокаў рэвалюцыі 1905 г. у Расіі, павінны азнаёміцца з формамі і мэтадамі барацьбы бальшавікоў. Асновай барацьбы зьяўляецца адзіны рэвалюцыйны фронт.

Неабходна павесьці моцную барацьбу за выкрыцьцё правадыроў сацыял-дэмакратыі і сацмола.

Дзесяткі год назад Ленін ужо ўказаў прычыны, якія прывялі сацыял-дэмакратыю ад сацыял-эвалюцыянізму да сацыял-шавінізму, да сацыял-імпэрыялізму і адкрытай контр-рэвалюцыі, якую ён выкрываў на ўсіх этапах сваёй дзейнасьці і супроць якой ён самым рашучым чынам змагаўся. Ён дамагаўся ад германскіх левых, на чале якіх стаялі Карл Лібкнэхт і Роза Люксэмбург, арганізацыйнага разрыву з рэфармістам, чаго германскія левыя з прычыны іх палоўцэнтрысцкай пазыцыі, адчас, не зрабілі. Установка Розы Люксэмбург асабліва падпала пад жорсткую крытыку. Крытыкуючы напісаную ёю ў часе вайны пад псэўдонімам Юніўс брашуру пад загалоўкам «Вайна і крызіс сацыял-дэмакратыі», Ленін сказаў наступнае: «Юніўс ня зусім вызваліўся ад уплыву асноўдзінга германскіх, у тым ліку нават левых сацыял-дэмакратаў, якія базяцца расколу і не адважваюцца да канца фармуляваць рэвалюцыйныя лозунгі».

Таму неабходна вытлумачыць масам працоўнай моладзі цэнтрысцкую ўстаноўку і антыленінскія тэорыі Розы Люксэмбург, аб якіх яна ў радзе прынцыповых пытаньняў (недацэнка кіруючай і арганізуючай ролі партыі, тэорыя стыхійнасьці, памылкі ў нацыянальным сялянскіх пытаньнях, ацэнка імпэрыялізму) разыходзілася з Леніным і скочвалася да трацкізму.

Хістаньне германскіх левых паміж бальшавізмам і меншавізмам прывялі да таго, што Лібкнэхт пры першым галасаваньні ў рэйхстагу не галасаваў супроць ваенных кредытаў, а ўстрымаўся. Ён, аднак, усьвядомлівае сваю памылку і пры другім галасаваньні заняў правільную пазыцыю, стаўшы на бок рашучай рэвалюцыйнай барацьбы супроць вайны, арганізуючы гэту барацьбу і быў, у розультаце, кінуты ў турму. Бясстрашная антымілітарыстычная барацьба Лібкнэхта была і застаецца прыкладам вартым перайманьня для пралетарскага юнацкага руху.

У сучасны момант на ўсходзе японскі імпэрыялізм вядзе грабежніцкую вайну ў Манчжурыі, падрыхтоўваючы плацдарм для вайны з Савецкім Саюзам. Антысавецкае цкаваньне, у якім асабліва вызначаецца сацыял-дэмакратыя, прагнятваецца і ўзмацняецца.

Падрыхтоўваецца новая канфэрэнцыя па разбраеньні, якая мае на мэце скрыць за дымовай заслонай балбатні ліхаманкавыя ўзбраеньні імпэрыялістаў. Гэта ставіць задачу барацьбы супроць імпэрыялістскай бойні ў Кітаі, супроць падрыхтоўкі вайны з Савецкім Саюзам. Барацьба гэта павінна весьціся шляхам правядзеньня дэманстрацый, сходаў пратэсту, шляхам узмацненьня работы на ваенных прадпрыемствах, стварэньня камсамольскіх ячэек ва ўсіх прадпрыемствах, што маюць ваеннае значэньне, шляхам арганізацыі рэкруцкіх аб'яднаньняў і работы ў рэгулярнай арміі кожнай буржуазнай краіны. Неабходна павесьці ў сувязі з канфэрэнцыяй на разбраеньні шырокую кампанію для выкрыцьця нацыфізму сацмола, асабліва яго «левай» фразэалёгіі. Ажыцьцяўленьне ленінскага вучэньня ў барацьбе з фашызмам азначае выкананьне задачы арганізацыі масавай барацьбы супроць фашызму. Устаўленьне адзінага пралетарскага фронту, ідэалёгічная масавая барацьба і масавая самаабарона — весь асноўная задача ў барацьбе з фашызмам.

Троба рашуча змагацца супроць мэтадаў індывідуальнага тэрору, які зьяўляецца праяўленьнем «левай» фразэалёгіі і адступленьнем перад труднасьцямі масавай работы.

Кампанія Л. Л. Л. павінна ў гэтым годзе служыць наваротным пунктам у барацьбе за навынёсьне ідэалёгічна-палітычнага ўзроўню членаў камсамолу, за іх камуністычнае выхаваньне ў духу марксызму-ленінізму. Троба ўзброіць камсамольцаў вучэньнем Леніна, гістарычным вопытам бальшавізму, яго ідэалёгічнай непрымірымасьцю ў адносінах да апартунізму ўсіх адценьняў, прыміренцтва і гнілога лібералізму ў адносінах да самых нязначных скажэньняў тэорыі і практыкі марксызму-ленінізму.

Асновай для гэтага навароту ў справе ўзьяднаньня ленінскага выхаваньня моладзі на больш высокую ступень павінен служыць ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция», які мае надзвычай вялікае палітычнае значэньне для ўсіх сэкцый КІМ'у. Увязваючы пастаўленыя тав. Сталіным пытаньні з актуальнейшымі праблемамі кожнай данай краіны, трэба шырока папулярызаваць гэты ліст ва ўсіх арганізацыях, абмеркаваць яго, пачынаючы ад ЦК і да ячэйкі, і ўжыць канкрэтныя меры для ажыцьцяўленьня зьмешчаных у ім указаньняў.

Выкрываючы на аснове гэтага ліста прынцыповыя памылкі Розы Люксэмбург і германскіх левых, вядучы барацьбу з замоўчваньнем і затушоўваньнем гэтых памылак, трэба разам з тым паказаць працоўнай моладзі, што імёны Розы і Карла ўвайшлі ў гісторыю, як імёны барацьбітоў за вызваленьне германскай рабочай клясы, якія хаця і са спазьненьнем, але ўсё-ж нарвалі з II Інтэрнацыяналам і канчаткова ўступілі на шлях пралетарскай рэвалюцыі. Той факт, што яны былі з-за вугла забіты рукой сацыял-дэмакратычных забойцаў зьвязвае іх непарыўна з рэвалюцыйным пралетарыятам і камунізмам.

Увязваючы ленінскую тэорыю з рэвалюцыйнай практыкай штодзённай барацьбы рабочай клясы, узьнімаючы барацьбу на два фронты на прынцыповую вышыню, сэкцыі КІМ'у пасьпяхова будуць прасоўвацца наперад па шляху ператварэньня ў масавыя арганізацыі і пераможна вырашаць гістарычныя задачы, якія стаяць перад КІМ'ам. (ТАСС).

# На 6 СТУДЗЕНЯ—ТОЛЬКІ 46,2 ПРОЦ. ПЛЯНУ

## КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК ІЛЬНАВАЛАКНА ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ—ТАКАВА ЗАДАЧА ДНЯ

### За пяціднеўку ўсяго 2,2 проц. прыросту

На 6 студзеня па БССР загатоўлена 14298 тон ільнавалакна. Гадавы плян выкананы на 46,2 проц.

Прырост за 5 дзён складае ўсяго 2,2 проц. Між тым, па 6 сьнежня навінна ўжо было быць загатоўлена 90 проц. прадукцыі ільнавалакна.

Пэўны зрух заўважаецца толькі па калгасным сэктары, які на 6 студзеня сваё заданьне выканаў на 74 проц. супроць 56,7 проц. па 31 сьнежня. Загатоўкі-ж ільнавалакна па індывідуальным сэктары амаль не пасунуліся ўперад—плян выкананы на 30,4 проц. супроць 29,2 проц. у мінулую пяціднеўку.

Гэты разрыў паміж тэмпамі загатовак у калгасным і аднаасобным сэктарох зьяўляецца вынікам палітычнай недацэнкі ролі аднаасобніка, якая мае месца ў радзе раёнаў. Гэта недацэнка выяўляецца ў адсутнасьці належнай масавай работы сярод бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у няпрыняцьці практычных мер да фарсаваньня ільнаапрацоўкі ў індывідуальным сэктары. Далёка ня ўсе раёны зьмелі наладзіць сапраўды апэрацыйнае кіраўніцтва апрацоўкай і загатоўкай ільну ў аднаасобным сэктары. Амаль зусім не практыкуецца арганізацыя калгасамі грамадзкага бунэру адстаючых аднаасобных вёсак. Нідзе яшчэ не наладжана сумесная апрацоўка ільну калгасамі і аднаасобнікамі.

Ігнараваньне аднаасобнага сэктару стварае сярэдняючую глебу для шкодніцкай работы кулака, які ажыцьцяўляе за разбазараваньне таварнай прадукцыі.

Ільназагатоўкі ў БССР, якая зьяўляецца адным з ільнаводчых раёнаў Савецкага Саюзу, адыгрываюць перапачатковую ролю. Праз 10 дзён зьбіраецца XIV зьезд КП(б)Б, які падагуліць вынікі нашай работы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба за лён павінна заняць пачэснае месца ў гэтых выніках гераічнай барацьбы за сацыялізм.

Рашучая барацьба за ліквідацыю торможаў у ільназагатоўках зьяўляецца зараз адной з важнейшых задач кожнай партыйнай арганізацыі, кожнага партыйца.

Практыка перадавых калгасаў гаворыць аб поўнай магчымасьці выканаць вызначаныя кляны. Папіраючы гэту практыку, павышаючы тэмпы ільнаапрацоўкі і разгортваючы сапраўды масавую работу, трэба неадкладна дабіцца бальшавіцкага разгортваньня ільназагатовак.

**Перамога на фронце загатовак ільну зьявіцца лепшым падарункам XIV зьезду КП(б)Б, будзе моцным ударам па апартуністах, якія тармозяць тэмпы кампаніі, па клясавым ворагу, што імкнецца сарваць нармальнае снабжэньне нашых тэкстыльных фабрык сырцом.**

### Загады замест практычнай дапамогі

БЯЛЫНІЧЫ.

Той факт, што па 1 студзеня з 4.300 цэнт. ільнавалакна загатоўлена толькі 1. 722 цэнт.—40 проц., яркі гаворыць аб слабых тэмпах загатовак па Бяльніцкім раёне.

Прычыну такога становішча трэба шукаць у тым, што гэта важнейшая кампанія да сёньняшняга дня яшчэ не арганізавана сапраўды па-бальшавіцку. Характэрна адзначыць, што па ўсім раёне не адкрыт ні адзін апрацоўчы пункт. Мерапрыемствы мясцовых арганізацый і, у прыватнасьці, райкаапсаюзу заключаюцца ў тым, што іх прадстаўнікі робяць гастрольныя паездкі па калгасах.

Замест таго, каб арганізаваць калгасную масу і практычна дапамагчы паставіць арганізацыю працы на належную вышыню, прыезджыя раённыя работнікі ў радзе выпадкаў займаюцца адміністраваньнем. Прыбываючы ў калгас, такія гастралёры маюць справу толькі з праўленьнем і шляхам дачы загадаў імкнуцца... дабіцца пералому. З масай гэтыя прадстаўнікі раёну не гавораць, сярод яе адпаведнай работы ня лічаць патрэбным праводзіць.

Ня прыходзіцца гаварыць, што такія гастрольныя паездкі ніякіх станоўчых вынікаў не даюць. Між тым, зусім зразумела, што толькі адпаведным чынам разгорнутая масавая работа з калгасьнікам, мабілізацыя яго на барацьбу і за колькаснае, і за якаснае выкананьне плану, можа даць патрэбны эфэкт. Невыкананьне-ж гэтых умоў вядзе да ганебнага адставаньня і асабліва на пучастку барацьбы за якасьць валакна.

Адзначан рад выпадкаў, калі калгасам прыходзіцца па некалькі раз прывозіць сваю прадукцыю на прыемныя пункты, пакуль ад іх прымуць лён. Прычына — несдавальняючая якасьць валакна. Тое-ж самае і з ільна здатчыкамі—аднаасобнікамі. У пэўнай меры гэта ёсьць вынік шкодніцкай дзейнасьці кулака і яго падпявал. Але побач з гэтым трэба сказаць, што нічога ня зроблена, каб растлумачыць масе калгаснікаў і аднаасобнікаў усю важнасьць добраякаснай апрацоўкі валакна. Ні адной інструкцыйнай нарады па гэтым пытаньні ня было. Прыёмшчыкі не выяжджаюць у калгасы і вёскі, каб на месцы расказаць аб патрабаваньнях, што прад'яўляюцца прыемнымі пунктамі да ільну.

З самацёкам у такім важнейшым мерапрыемстве трэба неадкладна пакончыць. Раённая партарганізацыя абавязана стаць на чале кампаніі ільназагатовак, якая ва ўмовах Бяльніцкага раёну мае вялікае значэньне.

Арганізацыі Бяльніцкага раёну павінны неадкладна паварнуцца тварам да ільназагатовак і дабіцца такіх тэм паў работы, каб мець магчымасьць рапартаваць XIV партзьезду аб рашаючай перамозе на гэтым адказьнейшым вучастку.

С. Гольдбэрг.

### Крывая тэмпаў зьнізілася

**ВУШАЧЫ.** (БЕЛТА). Крывая тэмпаў ільназагатовак па Вушацкім раёне зьнізілася. Замест 5-6 проц. прыросту ў пяціднеўкі першай палавы сьнежня, апошняя пяціднеўка тэтага месяца дала прырост толькі ў 1½ проц. Агульны раённы плян выкананы на 44,3 проц.

Гэта вынік вельмі слабай работы загатоўчых арганізацый і ільнаапрацоўчых пунктаў. Разгалгасаюз не вабясьпечыў павышэньня тэмпаў ільнаапрацоўкі ў калгасах, ня прыняў належных мер да ліквідацыі некарысьлівасьцей у арганізацыі працы на ільнапрацоўцы. Масавай работы не ачуваецца.

Прыведзеныя факты сьведчаць, што ільназагатоўкі зноў не апынуліся ў цэнтр увагі раённых арганізацый.

Вушацкі раён павінен крута ўзьняць тэмпы, па-бальшавіцку ажыцьцяўляючы дырэктывы партыі і ўраду аб ільназагатоўках.

Адказны рэдактар—М. ГАРЫН.

### Паведамленьні

— Усім рэдкалегіям шматтыражак і насьценгазэт. 10/I.32 г. роўна ў 7 гадз. веч., у каб. дому Дому Камасьветы такой № 19 адбудзецца групавая кансультацыя членаў рэдкалегій шматтыражак і насьценгазэт. Парадак дня: даклад адказнага сакратара рэдакцыі газ. «Зьвязда» т. Дзялюка на тэму: «Вараньбе з трацкісцкай кантрабандай на газэтным фронце».

— Сёньня, 9 студзеня, у 8 гадз. веч., у польскім клюбе імя Р. Люксэмбург—пракат сходу асьветнікаў-палякаў з удзелам рабочых палякаў. На парадку дня — працяг спрэчак на даклад тав. Будкевіч і даклад т. Губер аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.


Заутра а 10 гадз. раніцы
ў памяшканьні кабінэту рэдактара „Зьвязды"
УНЕЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КОНКУРСНАЙ КАМІСІІ ПРЫ „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"
па кіраўніцтве абмеркаваньня „Правдай" конкурсных нізавых газэт.
Запрашаюцца рэдактары ўсіх цэнтральных газэт.

АНОНС! СКОРА!
Новы гукавы мастацкі гаворачы фільм
СНАЙПЭР
У ГАЛ. РОЛЯХ:
Пётр САБАЛЕЎСКІ—салдат.
Барыс ШЛІХТЫНГ — афіцэр.
Рэжысэр С. ЦИМАШЭНКА.
Дзеяньне адбываецца на франка-германскім фронце ў час імпэр. вайны.
САЧЭЦЬ ЗА РЭКЛЯМАЙ!

Чыр. Зорка — Каса адкр. з 1 г. дня. Гукавы мастацкі фільм ЗЯМЛЯ ПРАГНЕ. Зьвыш праграмы Песьня аб Казакстане
КУЛЬТУРА — Пач. 7, 8-40, 10-30. Новы мастацкі японскі фільм Што арабіла не гэтакай. Зьвыш прагр. кінадрама ў 2 ч. БЯССТРАШНЫ КЭН.
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Каса адкр. з 12 г. дня. Амэрык. маст. фільм Навальніца ў Каліфорніі. Зьвыш прагр.—ХРОНІКА
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Эпізод з грамадз. вайны. Палац і цытадэля у 10 ч. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.
„СПАРТАК" — Пач. 6, 7-30, 9 і 10-45. Каса—ад 5. Выдатны фільм КРЫЖ І МАУЗЭР трагедыя ў 8 частках.

АДКРЫЦЬЦЁ
1-га ўсебеларускага зьезду ТПР
адбудзецца сёньня, 9-га студзеня, у 19 гадз. у клюбе К. Маркса
зьезду—
Далейшая праца зьезду будзе праводзіць у клюбе КІМ.
Для членаў ТПР уваход па членскіх білетах.
Аргбюро ТПР Бел.

КІНО „Пралетары" Сёньня, 9 студзеня і штодзённа амэрыканская трукавая камедыя
ПАЗНАЕМЦЕ МЯНЕ
у 7 частках
У галоўн. ролі Дуглас-Мак-Лін.
Пачатак дзённых сэансаў у 2 г., 1 3-30. Пачатак вечарнік—у 6, 7-15, 8-30, 9-45, 11-г.
КАСА адкрыта з 12 г. дня.

МЕНКАМГАС купляе каменьні па цане 15 руб. за куб. мэтр.
Грошы выплачваюцца пры здачы каменьняў на наступных пунктах: 1) Менск, Пярэсна, Крапоткіна, 49, 2) Барысаўскі гасьцінец у 3-ім Лагойскага гасьцінцу, 3) На 1-й Доўгабродзкай вул.
Частковая выдаюцца прамтавары.
Адрас: Менкамгас, плян Волі № 2.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР
адбудзецца 10-га студзеня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК МОПР'у
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Зацьвярджэньне тэзісаў НКЗ БССР аб задачах МОПР'у ў 3-й бальшавіцкай вясьне.
2. Зацьвярджэньне тэзісаў Гомельскага ГК МОПР'у аб рабоце на буйных прадпрыемствах.
3. Зацьвярджэньне тэзісаў Віцебскага ГК МОПР'у аб рабоце ў сацыялістычным сэктары вёскі.
4. Справаздача рэдкалегіі газэты „МОПР'у.
5. Рознае.
З прычыны важнасьці пытаньня, яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК і прэзыдыуму—абавязкова.
Запрашаецца гараджані актыву.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

БЕЛВОДТРЭСТУ патрэбны буравыя майстры.
Аплата па згодзе.
ДАВЕДАЦЦА Менск, Старажоўская, 11, БЕЛВОДТРЭСТ.

ІНСТЫТУТ савецкага будаўніцтва і права Беларускай Акадэміі Навук.
9 студзеня, у 19 гадз., у памяшк. прыродазнаўчага корпусу (Універсытэцкі Гарадок, 2-гі паверх) адбудзецца
ПАСЯДЖЭНЬНЕ
Інстытуту савецкага будаўніцтва і права БАН.
У парадку дня—даклад т. Лучыньскага на тэму:
„Аб перабудове матавай работы сельсаветаў пойдзе ўшчыльнь".
Уваход вольны.

10-га студзеня у гор. Менску адкрываецца
1-шы ўсебеларускі зьезд вынаходнікаў
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Роля і задачы вынаходніцтва ў справе сацыялістычнага будаўніцтва (т. Мамемштэйн).
2) Выкананьне рабочых прапаноў і вынаходніцтва па прамысловасьці ВСНГ'у у 1931 г. і плян рацыяналізацыі на 1932 г. (т. Русановіч).
3) Разгледжаньне статуту т-ва вынаходнікаў (т. Мінітрыні).
4) Выбары: а) савету вынаходнікаў, б) рэвізійнай камісіі, в) дэлегатаў на ўсесаюзны зьезд вынаходнікаў.
Зьезд адкрываецца ў 6 гадз. у памяшканьні клюбу мэдсанпрацы.
Аргбюро ЦСПСБ т-ва вынаходнікаў.

Будаўнічая частка Менкамгасу па дабрабыце горду ЗАПРАШАЕ на сталую працу 1 інжынэра па дар. буд. 3 тэхнікаў, 1 бухгальтара, 2 рахункаводаў.
Аплата па згодзе.
Даведацца штодзённа ад 13 да 15 гадзін у Менкамгасе—плян Волі, № 2, тэл. № 11-43.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
20 студзеня 1932 г. адкрывае ў Віцебску
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КІНО-ТЭХНІКУМ
з 2 аддзяленьнямі
а) кіно-тэхнічнае.
б) сцэнарнае.
Тэрмін навучаньня тры гады.
Кіно-тэхнічнае аддзяленьне ўкамплектавана. На сцэнарнае аддзяленьне прымаюцца: рабочыя, калгаснікі і іх дзеці, работнікі пралетарскай літаратуры, тэатраў і рабкораўскія гурткі, скончаўшых 7-годку, або рэвуплежную навучальную ўстанову. Узрост ад 16 да 30 год. Асноўная частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам. Дакументы неабходна прадставіць наступныя:
а) анкету, б) пасьведчаньне аб адукацыі, в) мэтрыку, г) даведку аб сацыяпаходжаньні, д) аб стане здароўя, е) дакументы аб адносінах да вайсковай службы. Працуючыя прадстаўляюць камандыраванае пасьведчаньне.
Дакументы прымаюцца да 15 студзеня па адрасе: г. Віцебск, Віцебскае Аддзяленьне Белдзяржкіно, Вакзальная вул. № 26.

Даводзіцца да ведама, што з 10 па 20 студзеня г. г.
ПА КІНО-ТЭАТРАХ „Чырвоная Зорка", „Інтэрнацыянал" і „Пралетары"
праводзіцца
ДЭКАДНІК РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ.
Просьба да ўсіх наведвальнікаў кіно здаваць свае прапановы аб працы кіно-тэатраў з мэтай зьнішчэньня недахопаў у іх працы і паляпшэньня абслугоўваньня працоўных.
Заявы і прапановы прымаюцца: кіраўніцтвам трэсту Белдзяржкіно—Савецкая, 90, Менаддзяленьнем БДК—Рэвалюцыйная, 4, загадчыкамі кіно-тэатраў, а таксама дзяжурнымі ў фойе тэатраў у часе вечэрніх сэансаў.
Групком кіно-тэатраў Менданрыкіно.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА
10-месячныя курсы вэтфэльчароў
пры Круглянскім вэттэхнікуме і на падрыхтоўчыя курсы да весьняного набору.
На курсы вэтфэльчароў і падрыхтоўчыя прымаюцца асобы з адукацыяй 5-6 груп сэмігодзі.
Да заявы прыкладаць дакументы: аб сацыяльным становішчы і пахаджаньні, адукацыі і ўзросьце.
У заяве робіцца адзнака, на якія курсы паступае.
Прыём заяў да 20 студзеня.
ДЫРЭКЦЫЯ.


# КАМПАРТЫЯ ФРАНЦЫІ ў барацьбе за чыстату генэральнай лініі партыі

ПАРЫЖ. У сувязі з надыходзячым партыйным зьездам, кампартыя Францыі мабілізуе зараз увагу арганізацыі па барацьбу за чыстату генэральнай лініі партыі.

«Юманітэ» апублікавала розалюцыю райкому кампартыі **Паўночнага раёну аб барацьбе з апартунізмам.** У гэтай розалюцыі райком канстатуе, што ва ўсіх зьвяньнях партыйнай арганізацыі раёну, аж да самага бюро райкому мелі месца праяўленьні небясьпечнай апартуністычнай тэорыі, якая адмаўляе магчымасьць пасьпяховай барацьбы рабочай клясы ва ўмовах сучаснага эканамічнага крызісу. Райком рашуча асуджае гэтыя выступленьні, якія вядуць да страты рэвалюцыйнай пэрспэктывы і адзначыў, што раённае бюро ў цэлым дагэтуль слаба змагалася з апартуністычнымі ўхіламі.

Разам з тым, канстатуючы спробы выключаных рэнэгатаў - трацкістаў прасякнуць у партыю, райком прызнае недапушчальнымі праяўленьні гнілога лібералізму ў адносінах да контр-рэвалюцыйнага трацкізму. Рэзалюцыя рашуча асуджае таксама дзейнасьць «лявацкай» групы Барбэ-Солер. Для таго, каб мабілізаваць партыйную арганізацыю на барацьбу з апартунізмам райком лічыць патрэбным пачаць **шырокую кампанію барацьбы на два фронты, супроць правага і «левага» ўхілаў.**

Генэральны сакратар кампартыі Францыі тав. **Торэс** выступіў у сувязі з гэтым у «Юманітэ» з перадавой, у якой паказвае на сур'ёзныя памылкі, дапушчаныя партыйнай арганізацыяй і ўнітарнымі прафсаюзамі ў гэтым раёне. «Тэорыю» аб немагчымасьці пасьпяховай барацьбы рабочай клясы ў час крызісу, тав. Торэс лічыць сацыял-дэмакратычнай. Анартуністам ня ўдасца замазаць посьнехі, атрыманыя кампартыяй у часе клясавых баёў у вугальным раёне Поўначы і ў Рубе, калі была правільна ўжыта тактыка «кляса супроць клясы».

Тав. Торэс, паказваючы на трацкісцкія вылазкі ў Парыжскім раёне, заклікае да рашучай, энэргічнай барацьбы з контр-рэвалюцыйным трацкізмам і з праяўленьнямі гнілога лібералізму ў адносінах да рэнэгатаў-здраднікаў рабочай клясы.

# Магчымасьць адстаўкі францускага ўраду

ПАРЫЖ, 7. Рад органаў францускага друку выказвае меркаваньні аб магчымасьці рэарганізацыі францускага габінэту ў сувязі з неабходнасьцю падпушчэньня кандыдата на пост ваеннага міністра, які (пост) вызваліўся са сьмерцю Мажыно, а таксама ў сувязі з тым, што, як піша правы друк, «Брыян не падыходзіць для падыходзячых міжнародных перагавораў». «Матэн» выказвае думку, што Лявэль павінен будзе ўзяць на сябе пост міністра замежных спраў, або прапанаваць гэты пост **Пэль Бенэдуру.**

Газэта, далей, указвае на магчымую кандыдатуру Турдэ на пост ваеннага міністра. Паводле слоў газэты, некаторыя дэпутаты парляманту лічаць магчымым, што Лявэль зробіць заяву аб адстаўцы габінэту.

### Сьмерць францускага вайсковага міністра Мажыно

ПАРЫЖ, 7. Паводле вестак агенцтва Гавас памёр францускі вайсковы міністар **Мажыно.**

### СУСЬВЕТНЫ АГРАРНЫ КРЫЗІС

ПАРЫЖ, 6. Газэта «Пэпюлер» падае цікавыя даныя, якія характарызуюць сусьветны аграрны крызіс. Так, сусьветныя запасы хлеба, якія складалі ў 1926 г. **34 млн. квінталаў** дасягнулі зараз **140 млн. квінталаў.** Запасы каучуку з **114 тыс.** тон у 1923 г. вырасьлі да **830 тыс.** у 1930 г. Запасы трасьніковага цукру за гэты перыяд павялічыліся з **95 млн. квінталаў** да **180 млн.** Сусьветныя запасы какао вырасьлі ў два разы, параўнальна з даваеннымі часам. (ТАСС).

# Па СССР

### Рабочыя „Краснопутилстроя" выканалі гадавую праграму на 102,7 проц.

ЛЕНІНГРАД, 7. На аснове шырокага разгорнутага ўдарніцтва і сацпабарніцтва рабочыя «Краснопутилстроя» выканалі гадавую праграму рэконструкцыі заводу «Красный путиловец» на 102,7%. За год уступілі ў строй трактарна-механічная майстарня, другая тэрмічная, турбакампрэсарная майстарні і другая лінейная, магутнасьцю ў 18.000 тон ліцьця ў год. Кампрэсарная майстарня набудавана за адзін месяц 20 дзён замест трох месяцаў паводле плану.

Рабочыя «Краснопутилстроя» прыступілі зараз да пабудовы магутнай паравозазборачнай майстэрні, фабрыкі кухні і інш. цэхаў.

### Новыя дасягненьні савецкай тэхнікі

ЛЕНІНГРАД, 7. Цэнтральная радыёлябараторыя ВЭО выпусьціла пробны экземпляр прыёмнага ўстройства для ўрадавых, магістральных, тэлеграфных і тэл